ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок конп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідкі. Зьвяш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—31 г. бярэцца 10 проц. -вадатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ ЗЛУЧАЙЦЕ

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

АЎТОРАК, 18 лютага 1930 г.
№ 41 (3549)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

За баявыя тэмпы, за бальшавіцкую якасьць работы!

Узмацненьне дробна - буржуазных хістаньняў і ваганьняў характэрна для ўсякага ПАВАРОТУ ў палітыцы нашае партыі. Пры кожным павароце гэтыя хістаньні пранікаюць ня толькі ў асяродзішча пралетарыяту, але і ў рады нашае партыі.

Наш паварот ад палітыкі абмежаваньня і выціскання капіталістычных элемэнтаў да НОВАЙ палітыкі — ліквідацыі кулацтва, як клясы, выклікае новае ўзмацненьне ПЕРШ ЗА ЎСЁ правааапартуністычных ваганьняў і адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі. Правыя ўхілістыя, якія прапаведуюць мірнае ўрастаньне кулака ў сацыялізм, якія зьяўляюцца трубадурамі клясавага міру, якія ідуць па лініі пастаянных уступак капіталістычным элемэнтам — выступаюць цяпер, ва ўмовах павароту партыйнае палітыкі, супроць гэтага павароту, становячыся галоўным тормазам у справе яго ажыцьцяўленьня. Правыя выступаюць супроць тых тэмпаў калектывізацыі, якія разгортваюцца пры актыўным удзеле шырокіх бядняцка - серадняцкіх мас, што ідуць пад кіраўніцтвам нашае партыі. Правыя выступаюць супроць палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, бо іх тэорыі аб мірным сужыцьці з кулаком зьяўляюцца фактычна пазыцыямі, якія ўвекавечваюць існаваньне клясаў, клясы сельскае буржуазіі, якія (тэорыі) па сутнасьці сваей вядуць да буржуазнай растаўрацыі.

На практыцы правыя апартуністы прабуюць зрываць справу рашучай барацьбы за буйныя тэмпы калектывізацыі, зрываць практычнае ажыцьцяўленьне лёзунгу раскулачваньня ў раёнах суцэльнае калектывізацыі. Яны (правыя) зьяўляюцца рупарам і абаронцаю кулака. Вестні з месц гавораць аб цэлым радзе фактаў падобнага правага апартунізму на практыцы. Гэты правы апартунізм часта хаваецца за панічнымі крыкамі, аб, быццам, непасільных тэмпах у справе разгортваньня калектывізацыі. Часта на толькі асобныя камуністыя, але і паасобныя арганізацыі адстаюць ад тэмпаў, цягнуцца ў хвасьце падзей, ня ідуць на чале магутнага руху бядняцка - серадняцкіх мас за суцэльную калектывізацыю і, на яе падставе, за рашучае і арганізаванае ажыцьцяўленьне ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Усе арганізацыі нашай КП(б)Б зьверху да нізу павінны яшчэ больш узмацніць барацьбу з галоўнай небясьпекай—правым апартунізмам, які цягне партыю назад, які тармозіць справу сацыялістычнай рэканструкцыі нашай вёскі.

Партыя змагаецца і будзе змагацца за баявыя тэмпы калектывізацыі, за дапейшую мабілізацыю шырокіх батрацка - бядняцкіх і серадняцкіх мас вакол суцэльнае калектывізацыі. Ніякіх паслабленьняў у тэмпах!

З усёй рашучасьцю і арганізаванасьцю неабходна ажыцьцяўляць у раёнах суцэльнае калектывізацыі ліквідацыю кулацтва, як клясы. Самая бязьлітасная барацьба супроць тых, хто прабуе перашкаджаць практычнаму правядзеньню раскулачваньня ў раёнах суцэльнае калектывізацыі. Распачатую барацьбу за экспрапрыяцыю вясковых экспрапрыятараў, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, трэба працягваць з усёю цьвёрдасьцю, непахіснасьцю і непрымірымасьцю.

У раёнах, дзе яшчэ слаба разгорнуты калгасны рух, дзе яшчэ ня прышлі ў рух бядняцка - серадняцкія масы сялянства — там мы часова пакідаем лёзунг абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў вёскі. Але гэты лёзунг застаецца там, як лёзунг ДАПАМОЖНЫ ў адносінах да ГАЛОЎНАГА лёзунгу — ліквідацыі кулацтва, як клясы. Лёзунг абмежаваньня і выціскання павінен служыць там справе падрыхтоўкі да ХУТЧЭЙШАГА ПЕРАХОДУ шырокіх бядняцка - серадняцкіх мас да суцэльнае калектывізацыі і стварэньня там, такім чынам, падстаў для практычнага ажыцьцяўленьня галоўнага лёзунгу — ліквідацыі кулацтва, як клясы. За баявыя тэмпы дапейшага разгортваньня калектывізацыі, за ўцягненьне ў калгасны рух усё больш шырокіх мас бядняцка - серадняцкага сялянства, за баявую працу па падрыхтоўцы раёнаў, дзе яшчэ няма суцэльнае калектывізацыі, да суцэльнай калектывізацыі, да пераходу да галоўнага лёзунгу — вось як стаіць пытаньне.

Разьмер калектывізаванае плошчы БССР на 10 лютага раўняецца 59,6 проц., што складае 2½ мільёны гэктараў пахаці. Нашы дасягненьні ў галіне суцэльнае калектывізацыі, адначасна з гэтым цэлы рад буйнейшых недахопаў, ставяць з усёй сілай і вострасьцю кардынальнейшую праблему барацьбы за ЯКАСЬЦЬ нашае работы. На 10-га лютага было абагулена насенных фондаў у калгасах — 7.527 тон, што ў адносінах да разьмеру калектывізацыі на 10 лютага складае 60 проц. Гэтыя лічбы павінны мабілізаваць усе сілы партыі на выкананьне ва што-б там ні стала задачы 100-процантнага абагуленьня насенных фондаў у тэрміны, пастаўленыя партыяй і ўрадам. З усяе колькасьці ўлічанай жывёлы ў калгасах у 675 тысяч галоў абагулена 197 тысяч галоў, гэта ёсьць — 29,3 проц. Ганебнае і трывожнае адставаньне! Павысіць витаўтаасьць працы ў гэтай галіне — абавязак усіх партыйных і савецкіх арганізацый. Няважна стаіць справа з работай па ачыстцы збожжа. Важнейшым пытаньнем — АРГАНІЗАЦЫЯЙ РАБОТЫ ЎНУТРЫ КАЛГАСАЎ да гэтага часу месцы зусім не займаюцца. Ня ўсюды яшчэ мабілізавана ўвага на падрыхтоўку калгасаў да пасеўнае кампаніі, па ўсіх вучастках пасеўнага фронту.

ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АДДАЮЦЬ ЯШЧЭ НЕДАСТАТКОВУЮ ЎВАГУ СПРАВЕ АРГАНІЗАЦЫІ БАТРАЦТВА І БЕДНАТЫ ЎНУТРЫ КАЛГАСАЎ. Ня ўсюды яшчэ на мясцох пераглядваецца практыка работы сельсаветаў, каапэратываў, крэдытнай сыстэмы і г. д. з пункту погляду ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, на падставах суцэльнае калектывізацыі.

Супроць нядбальства і адставаньня! За бальшавіцкія тэмпы работы! За бальшавіцкую якасьць работы!

Ударяючы з усёй сілай па праваапартуністычных тэорыях і практыцы, трэба ўзмацніць барацьбу супроць перагібаў у ажыцьцяўленьні новай палітыкі партыі. Многія прабуюць супроцьставіць справу суцэльнае калектывізацыі раскулачваньню і ліквідацыі кулацтва, як клясы, ня зьвязваючы адно з другім. Многія, закідаючы барацьбу за калектывізацыю, усе намаганьні сканцэнтроўваюць на голым раскулачваньні, на простым адміністраваньні. АДНАЧАСОВА З ГЭТЫМ МАЕЦЦА ЦЭЛЫ РАД ЗЛАЧЫННЫХ ФАКТАЎ, КАЛІ РАСКУЛАЧВАНЬНЕМ ЗАКРАНАЕЦЦА СЕРАДНЯК, ГЭТЫМ САМЫМ ФАКТЫЧНА ЗРЫВАЕЦЦА І СПРАВА БАРАЦЬБЫ ЗА СУЦЭЛЬНУЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ, І СПРАВА МАБІЛІЗАЦЫІ ВАКОЛ НАШАГА ЛЁЗУНГУ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ, СЕРАДНЯЦКІХ МАС СЯЛЯНСТВА. Усе гэтыя спробы якімі-б «левымі» фразамі яны не прыкрываліся, граюць фактычна на руку кулаку, на руку клясавому ворагу і зрываюць справу барацьбы за разгортваньне суцэльнай калектывізацыі. Трэба даваць жорсткі адпор авантурыстычнай палітыцы «левых» фразэраў, якія разам з правымі апартуністымі перашкаджаюць справе суцэльнай калектывізацыі і супроцьстаўляюцца правядзеньню павароту ў палітыцы нашай партыі. «Той, хто, замахваючыся на кулака, закранае серадняка, той, хто ня здольны на барацьбу з кулаком падняць побач з беднатой і серадняка, той прыносіць нам толькі шкоду, той скажае ленінскую лінію партыі» («Правда», 6 лютага).

Гураганным агнём зьмятаючы правых апартуністых, бязьлітасна змагаючыся з «левымі» апартуністымі і авантурыстымі, з рэцыдывамі трацкізму, партыя праводзіць з усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю палітыку ліквідацыі кулацтва, як клясы, на падставах нясупыннай барацьбы за суцэльную калектывізацыю і мабілізацыю вакол нашых лёзунгаў шырокіх бядняцка - серадняцкіх мас сялянства.

На 10 лютага па БССР сабрана 60% насеньня

50 проц. зямельнае плошчы рэспублікі пад калгасамі

АБАГУЛЕНЬНЕ ЖЫВЁЛЫ ІДЗЕ ВЕЛЬМІ ПАВОЛЬНА

Да 20-га лютага выканаць поўнасьцю плян ссыпкі насеньня

Калгас „Камунар“ выканаў заданьне

Калгасам «Камунар», Баваўнянскага сельсавету, Копыскага раёну, на сёнешні дзень абагулена поўнасьцю ўсё насеньне. Заданьне выканана нават з некаторым перавышэньнем. Усё абагуленае насеньне ачышчана.

Зараз калгас вядзе работу па абагуленьні жывёлы. Апошняя абагулена ўжо на 50 проц. Калгас паставіў сабе мэтай абагуліць жывёлу поўнасьцю не пазьней 25-га лютага.

Калгас „Чычэрына“ адстае

Работа па стварэньні насеннага фонду ў калгасе «Чычэрына» (Капыльскі раён, Менская акругі) пастаўлена вельмі дрэнна. Да гэтага часу насеньня абагулена менш чым на 50 проц. Аўсу паводле заданьня павінна быць абагулена 2.500 пуд., абагулена-ж усяго на сёнешні дзень толькі 1.200 пуд. Бульба яшчэ зусім не абагулена. Праўленьню калгасу трэба больш сур'ёзна аднесьціся да стварэньня насеннага фонду. Трэба ў тэрміновым парадку, разгарнуць шырокую работу па абагуленьні насеньня.

Ударная брыгада агранамаў

МАЗЫР. (Наш кар.). 28 агранамаў заселі ў апаратах акруговых устаноў і дагэтуль ні за што не хацелі ехаць у калгасы.

Гэтымі днямі адбыўся сход агранамаў, які зрабіў пералом. Тут-жа, на сходзе, 5 агранамаў абвясьцілі сябе ўдарнікамі і пастанавілі зараз-жа выехаць у калгасы, скласьці практычныя пляны пасеўнай кампаніі ў 70 калгасах, арганізаваць у іх насенныя фонды і абагуліць жывёлу. Агранамы - ўдарнікі паставілі перад сабою задачу арганізаваць 5 машына - конных станцый, закантрактаваць 800 галоў племяннай жывёлы і маладняку, арганізаваць у 70 калгасах злучаныя пункты і 15 леднікаў.

Ударная брыгада выклікала на сацспаборніцтва ўсіх агранамаў акругі пасьледваць іх прыкладу.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ. Разьмер калектывізацыі ўсёй с.-г. плошчы БССР на 10-га лютага складае 59,6 проц. Агульная колькасьць арганізаваных калгасаў — 3.763 з плошчаю пахаці ў іх каля 2 3 ПАЛОВ. МІЛЬЁНАЎ ГЭКТ.

ССЫПКА НАСЕННЫХ ФОНДАЎ. У абагуленыя насенныя фонды ў калгасах ссыпана збожжавых культур 7.527 тон, што ў адносінах да разьмеру калектывізацыі на 10-га лютага складае 60 проц., а ў адносінах да разьмеру калектывізацыі на 1-га лютага дае 70 проц. Мы ўжо адзначалі значны зрух упарад у параўнаньні з разьмерам засыпкі насеньня на 1-га лютага. Але нам трэба памятаць, што да поўнага выкананьня пляну яшчэ засталося 40 проц. — і кожны дзень павінен даць папаўненьне насенных фондаў.

Разьмер абагуленьня насенных фондаў па бульбе складае 103.000 тон, або 40,4 проц. выкананьня пляну. Як відаць, па бульбе разьмер абагуленьня НІЖЭЙШЫ, як па збожжавых культурах. Тут трэба яшчэ адзначыць, што бульба зараз знаходзіцца ў зямлі ў капцах, і калгасьнікі пакуль што выдаюць заліскі-абавязацельствы. У той момант, калі пачнуць раскопваць капцы (пасьля раставаньня зямлі), трэба будзе мабілізаваць усю ўвагу на неадкладную рэалізацыю выданых абавязацельстваў на ссыпку бульбы.

Адначасова з абагуленьнем насенных фондаў у калгасах ідзе стварэньне насенных фондаў пры камітэтах сялянскае ўзаемадапамогі. Гэтыя фонды пераважна будуць скарыстаны для аказаньня дапамогі бедняком і батраком пры ўнясеньні імі сваіх насенных паёў у калгасы. Паводле лічбовых даных на 10 лютага мы бачым, што камітэты ўзаемадапамогі ўскладзенае на іх плянавае заданьне выконваюць вельмі марудна—ссыпка насенных фондаў складае пакуль што толькі 43,4 ПРОЦ.

АБАГУЛЕНЬНЕ ЖЫВЁЛЫ Ў КАЛГАСАХ. З усёй колькасьці улічанай жывёлы ў калгасах у 675.000 галоў, абагулена 197.000 галоў, або 29,3 проц. Гэты процант трэба прызнаць зусім невыстарчальным. На мясцох паказваюць на тое, што абагуленьне жывёлы натыкаецца на рад арганізацыйных недахопаў—няма прыстасаваных памяшканьняў для разьмяшчэньня абагуленай жывёлы, угон жывёлы на далёкія адлегласьці прыводзіць да пазбаўленьня калгасьнікаў малака і г. д. Але з гэтых труднасьцяй арганізацыйнага парадку заўсёды можна знайсьці які-небудзь выхад (як прыстасаваньне існуючых сьвірнаў і гумнаў), і нельга наяўнасьцю дробных перашкод апраўдваць такі мізэрны разьмер абагуленьня жывёлы. Разьмер абагуленьня рабочай жывёлы яшчэ меншы — 25,4 проц.

АЧЫСТКА ЗБОЖЖА. Нам трэба ачысьціць насеньне ў разьмеры 195.000 тон. Між тым, на 10-га лютага ў нас ачышчана 79.000 тон, што складае 40,5% пляну. Нават пры наяўнасьці некаторага зруху за апошнія дні (на 1-га лютага насеньня было ачышчана толькі 27,8 проц.) прыходзіцца прызнаць ход ачысткі марудным.

ЗБОР ПОПЕЛУ. Плянавае заданьне па зборы попелу складае 22.000 тон, а на 10-га лютага сабрана толькі 5.700 тон, або 25,7 проц. Як мы бачым, збор попелу праходзіць пры надзвычайна слабым тэмпе. Пры агульным недахвацe ў нас штучных угнаеньняў такія нядбайныя, няўважлівыя адносіны да збору попелу зьяўляюцца злачыннымі.

ЗАДАТКІ НА ТРАКТАРЫ. Збор задаткаў на набыцьцё трактараў для калгасаў усё яшчэ не прасоўваецца ўперад. На 10-га лютага сабрана ўсяго каля 250.000 РУБ., што складае толькі 11,8 ПРОЦ. выкананьня пляну.

Тут прыходзіцца адзначыць, што Масква парашыла — у выпадку невыкананьня заданьня па рэалізацыі трактарных абавязацельстваў пераразмеркаваць плян завозу трактараў і ў першую чаргу адпусьціць трактары тым рэспублікам і краінам, якія выканалі свае трактарныя абавязацельствы.

Мала абвясьціць сябе ўдарнымі

Абагуленьне насеньня па Случчыне яшчэ не набыло патрэбнага размаху. На 14-га лютага па калгасах Случчыны абагулена 76 проц. насеньня, а камітэтамі ўзаемадапамогі абагулена ўсяго 40 проц. Многія сельсаветы яшчэ дагэтуль не абгаварылі пытаньня аб стварэньні насенных фондаў, як Казлоўскі і Сераскі і інш.

Кулакі, якія распрадаюць сваё насеньне, да гэтага часу не пакараны. На 14-га лютага па млынох яшчэ не разасланы дырэктывы аб забароне перамолу яравых культур. Між тым, млыны завалены насеньнем.

РВК не прыцягнулі яшчэ да адказнасьці сельсаветы, якія зрываюць работу па абагуленьні насеньня. Напрыклад, Сераскі і Казлоўскі сельсаветы не абагулілі ні аднаго грама.

Гэтымі днямі адбылася нарада старшынь сельсаветаў і рабочых брыгад, якія працуюць на вёсцы. На гэтай нарадзе сельсаветы абвясьцілі сябе ўдарнымі па выкананьні заданьня абагуленьня насенных фондаў. Але мала абвясьціць сельсаветы абвясьцілі сябе ўдарнымі па выкананьні заданьня абагуленьня насенных фондаў.

Брыгадзір «Зьвязды» АПЯКІН.

Пад суд

Старшыні Заслаўскага і Грэскага раённых камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі т. т. Нясьцюк і Жук прыцягваюцца да судовае адказнасьці за злачынна нядбайныя адносіны да заготоўкі насеньня. У гэтых раёнах па лініі КСУ ў галіне загатоўкі насеньня амаль нічога яшчэ ня зроблена.

Магілеўшчына калектывізавана на 81,5 проц.

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Паводле даных на 10 лютага, па Магілеўшчыне ахоплена калгасамі 81,5 проц. агульнае плошчы.

4 раёны: Клімавіцкі, Крычаўскі, Чэрыкаўскі і Хацімскі калектывізаваны на ўсе 100 проц.; Шкловскі раён калектывізаваны на 96,6 проц.; Чырвонапольскі—на 92 проц. Адстаюць: Бялыніцкі, Чачэвіцкі і Лупалаўскі раёны.

Аб перавыбарах парторганаў

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

1. Бюро ЦК прапануе ўсім АК, РК і парт'ячэйкам зараз-жа распачаць падрыхтоўчую работу да справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў.

Тэрміны перавыбараў устанавіць наступныя:

а) справаздачна-перавыбарчыя кампаніі па гарадзкіх ячэйках правесьці з 1-га сакавіка па 1-га красавіка;

б) справаздачна-перавыбарчыя кампаніі па вясковых ячэйках правесьці з 16-га сакавіка па 15-га красавіка;

в) раённыя канфэрэнцыі правесьці: у горадзе з 1-га красавіка па 15-га, на вёсцы з 15 красавіка па 1-га мая;

г) акруговыя партканфэрэнцыі праводзіць у першых лічбах мая месяца (арыентовачна)

Узмоцнім падрыхтоўку да будаўнічага сэзону

У гэтым годзе ў капітальнае будаўніцтва нашае рэспубліканскае прамысловасьці ўкладаюцца вельмі значныя сродкі—да 52 мільёнаў рублёў. Своячасовае выкананьне будаўнічых работ, зьніжэньне сабекошту, мэханізацыя, ужываньне практыкі заходняэўрапэйскай і амэрыканскай тэхнікі, правільнае скарыстаньне ўсіх капіталаў, якія выдаткуюцца,—усё гэта патрабуе неадкладнай мабілізацыі сіл усяе нашае савецкае грамадзкасьці, усіх нашых партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый. Нельга не забываць ні на хвіліну, што ад пасьпяховага правядзеньня будаўнічых работ залежыць выкананьне пяцігодкі—гэтага нашага пляну вялікіх работ.

У мінулым годзе мы мелі рад буйных зрываў у галіне будаўніцтва: несвоячасовае складаньне праектаў, невыстарчальнае патаненьне работ, дрэнную падрыхтоўку рабочай сілы, слабое разгортваньне вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў з мясцовага сыр'ю, зусім нязначныя посьпехі ў мэханізацыі і ў выніку ўсяго гэтага, у радзе выпадкаў,—дрэнную якасьць новых будынкаў.

Будаўнічы сэзон гэтага году не за гарамі. Часу засталося вельмі мала. Ці ўнікнулі мы памылак мінулага, ці зроблена ўсе, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне будаўніцтва? На жаль, мы павінны даць у асноўным адмоўны адказ на гэтыя пытаньні. Весткі, якія дасылаюцца з месц, гавораць, што многімі арганізацыямі яшчэ ня ўлічаны ўрокі леташняй кампаніі. Тэмпы падрыхтоўкі невыстарчальныя і зусім не адпавядаюць грандыёзным задачам, пастаўленым перад намі партыяй.

Паранейшаму праекты паступаюць з вялікім спазьненьнем. Буйнейшая будаўнічая арганізацыя Белдзяржбуд да пачатку лютага атрымала толькі 19 праектаў з 40

Паранейшаму марудна заключаюцца дагавары на будаўнічыя работы. Паранейшаму паведамляюць аб марудным забясьпячэньні будаўніцтва матар'ялам. Паранейшаму мала зварачаецца ўвагі на вярбоўку рабочай сілы.

Усё гэта прымушае карэнным чынам зьмяніць характар падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону. У працягу тых тыдняў, што засталіся, трэба правесьці вялікую работу на забясьпячэньні своячасовага пачатку будаўніцтва. Партыя і ўрад далі рад канкрэтных заданьняў і паказаньняў. Задача нашых арганізацый—неадкладна прыступіць да правядзеньня іх у жыцьцё.

У першую чаргу — увага вытворчасьці матар'ялаў. ВСНГ, саматужная каапэрацыя, мясцовыя выканкомы павінны адразу-ж прыступіць да разгортваньня новых прадпрыемстваў па выпуску будаўнічых матар'ялаў і па пашырэньні існуючых. Прадукцыя новых прадпрыемстваў павінна быць выкарыстана ўжо для патрэб бягучага будаўнічага сэзону.

Падругое—упор на вярбоўку рабочай сілы. Нельга забываць, што сёлета вярбоўка зьвязана з вялікімі труднасьцямі. Наркампрацы, Калгасаюзу і саюзу рабземлес трэба зараз-жа вызначыць мерапрыемствы па ўрэгуляваньні адыходу рабочых з калгасаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на вярбоўку батракоў.

Патрэцяе—узмацніць удзел грамадзкасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва, арганізацыя ўдарных брыгад, увядзеньне бесьперапынкі, устанаўленьне масавага рабочага кантролю над работамі,—усё гэта дасьць нам магчымасьць зьнізіць сабекошт і палепшыць якасьць будаўніцтва.

Пачацьвертае—забясьпечыць палітычнае, культурнае і бытавое абслугоўваньне будаўнічых рабочых.

Папятае—палепшыць рацыяналізацыю будаўніцтва і дабіцца рашучага пералому ў мэханізацыі, стандартызацыі. Вялікае значэньне мае забясьпячэньне будоўлі кваліфікаваным інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам. Прыцягненьне да работ канчаючых ВТНУ і тэхнікуму, перападрыхтоўка старых спэцыялістых, перакідваньне інжынэраў і тэхнікаў з апаратаў непасрэдна на будоўлю дасьць нам магчымасьць зьмякчыць недахоп у інжынэрна-тэхнічным пэрсанале.

Пашостае—трэба ўзяць пад асабліва пільны кантроль найбольш важныя аб'екты прамысловага будаўніцтва.

Ні аднаго дня спазьненьня, ні аднаго неэфэктыўна скарыстанага рубля, за лепшую якасьць работ, за патаненьне будаўніцтва—вось лёзунгі, пад якімі павінна прайсьці кампанія будаўнічага сэзону гэтага году. Зімовай сьпячцы, марудносьці, непаваротлівасьці не павінна быць месца.

Пры непасрэдным удзеле ўсіх нашых партыйных арганізацый, пры іх непаслабным наглядзе за ўсім ходам работ мы даб'емся тут такіх-жа буйных посьпехаў, якіх мы ўжо дабіліся на іншых вучастках нашага гаспадарчага фронту.

Земорганы зрываюць рамонт с.-г. машын

Чыгуначныя майстэрні не нагружаны

Ніводнай машыны ня прывезена

ВОРША. (Наш кар.). Яшчэ два тыдні таму назад ДЭПО ст. Ворша прыгатавалася да рамонту с.-г. інвэнтару. З прадстаўнікамі акрза і акркалгасаюзу ДЭПО дагаварылася аб бесьперабойнай дастаўцы с.-г. інвэнтару для рамоту. Аднак, да гэтага часу ніводнае машыны для рамонту ў ДЭПО ня прывезена.

Толькі адзін трактар

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Мясцовыя с.-г. арганізацыі затрымліваюць справу рамонту сельска - гаспадарчага інвэнтару. ДЭПО два дні чакае ад акрэа і акркалгасаюзу с.-г. інвэнтару для рамонту. За ўвесь час гэтымі арганізацыямі быў прывезены ў ДЭПО толькі 1 трактар для рамонту, які і быў адрамантаваны.

Рабочыя ДЭПО прыгатавалі для падшэфнага раёну лемяшы і паліцы для плугоў, але да гэтага часу плугоў на рамонт ім ня прывезьлі.

У сувязі з недахопам жалеза ў каапэрацыі для рамонту, ДЭПО ўзьняло хадайніцтва аб водпуску яго з Рудмэталягандлю.

Чакаюць с.-г. інвэнтару

ЛЕПЕЛЬ. (Наш кар.). Больш тыдня, як ДЭПО ст. Лепель чакае дробнага с.-г. інвэнтару для рамонту, але ён не паступае.

Мясцоком вылучыў спэцыяльныя брыгады для непасрэднай сувязі з калгасамі, для атрыманьня ад іх с.-г. інвэнтару на рамонт.

З 370--толькі 20

Да арганізацыі машына-конных станцый фактычна ня прыступлена

Наркамзем і Белкалгасцэнтр... ня ведаюць

Выкананьне заданьня па арганізацыі ў БССР машына-конных станцый—пад пагрозай зрыву. Згодна дырэктывы ўраду, да -га сакавіка па Беларусі павінна быць арганізавана **370 машына-конных станцый.** Ня гледзячы на тое, што гэты тэрмін канчаецца праз два тыдні, ні Наркамзем, ні Белкалгасцэнтр ня ведаюць, як-жа пастаўлена работа па арганізацыі гэтых станцый. Між тым, рад акруг у свой час самі павялічылі заданьні па гэтых станцыях.

Паводле няпоўных вестак, у Гомельскай акрузе замест 40 станцый арганізавана **пакуль што 4,** у Менскай акрузе—замест 55—**3,** у Віцебскай акрузе арганізавана **13 станцый.**

Такім чынам, на сёнешні дзень замест 370 машына-конных станцый паводле вестак з 3-х округ арганізавана **толькі 20.**

Белсельтрэст павінен быў арганізаваць 41 станцыю, але зараз ён хадайнічае перад Наркамземам аб скасаваньні гэтага заданьня.

Важнае мерапрыемства па арганізацыі ў абагуленым сэктары цягавай сілы зрываецца. **Патрэбны рашучыя меры.**

Пляны вандруюць

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Па калгасах Бабруйшчыны да 1-га сакавіка павінна быць арганізавана 38 машына-конных станцый. Ня гледзячы на тое, што часу засталося мала, пакуль што ў гэтай галіне амаль што нічога ня зроблена. Акрвыканком толькі нядаўна зацьвердзіў плян арганізацыі станцый па кустох і раёнах. Гэты плян па кіраваны зараз райвыканкомам, якія ўнясуць у яго тыя ці іншыя папраўкі, так што зараз яшчэ канчаткова невядома, дзе будуць арганізаваны станцыі. Пакуль што, па вестках Паляводсаюзу, арганізаваны тры станцыі.

Колькі інвэнтару ёсьць у мясцох арганізацыі машына-конных станцый. Калгасаюз ня ведае. Аб тым, колькі абагулена коняй, таксама невядома. Паводле пляну, для станцый патрэбна закупіць 200 коняй. Пакуль што закуплена толькі 50.

Нічога ня зроблена

ВОРША. (Наш кар.). Паводле пляну, па Аршаншчыне павінна быць арганізавана 50 машына-конных станцый, па 100 коняй у кожнай. Але акрамя плянаў фактычна ў акрузе для стварэньня машына-конных станцый нічога ня зроблена.

У Журавічах чакаюць вясны

29-га студзеня прэзыдыум Магілеўскага акрвыканкому канчаткова зацьвердзіў плян арганізацыі машына-конных станцый і трактарных калён. Дырэктывы акрвыканкому прыбылі ў раёны толькі 6-7 лютага. Журавіцкі райвыканком на сёнешні дзень нічога не зрабіў для арганізацыі машына-конных станцый. Чакаюць вясны.

Брыгадзір «Зьвязды» КАРАЧУН.

Зрываецца падрыхтоўка спэцыялістых

Справа хутчэйшых тэмпаў падрыхтоўкі кадраў і іх якасьці зьяўляецца адным з цэнтральных пунктаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Між тым, дэканат факультэту народнай гаспадаркі БДУ зрывае гэтую справу. Ужо прайшлі два тыдні пасьля пачатку 2-га сэмэстру, а заняткі на 3 курсе амаль што яшчэ не пачаліся. Навучальны плян за 2-гі сэмэстр выканаць толькі на 25 проц. Калі да гэтага дадаць яшчэ тое, што выпуск нашага курсу зьяўляецца пасхораным і што ў першым сэмэстры заняткі пачаліся з спазьненьнем і навучальны плян таксама значна недавыканаць, дык становіча падрыхтоўкі спэцыялістых выявіцца даволі яскрава.

Мы, студэнты 3-га курсу, якія ў бліжэйшым часе павінны пайсьці на пратычную работу, патрабуем хутчэйшага ўмяшальніцтва партыйнай і савецкай грамадзкасьці ў гэтую справу.

Дырэктывы лістападаўскага пленуму ЎсеКП(б) аб падрыхтоўцы кадраў павінны быць выкананы.

ГРУПА СТУДЭНТАЎ 3-га КУРСУ

Вымова за бязьдзейнасьць

Парт'ячэйкі ў баку ад калектывізацыі

Парт'ячэйкі **Пухавіцкага раёну** (Менская акруга) радзе выпадкаў праяўляюць недапушчальную бязьдзейнасьць у кіраўніцтве калгасным рухам і падрыхтоўцы да веснавое сяўбы. Бюро раённага камітэту партыі аб'явясьціла вымовы сакратарам **Цытвянскай, Блускай** і **Новa-Сёлкаўскай** чэек КП(б) за пасыўнасьць у падрыхтоўцы да веснавое пасеўнае кампаніі.

Гэтыя ячэйкі зусім не працавалі свае работы. Усе практычная дзейнасьць ячэек не прыстасавана да задач калектывізацыі і веснавае сяўбы. Саўгаскія ячэйкі таксама не перабудавалі сваёй работы. Ячэйкі працуюць на дапушчальна марудным чарапашынымі тэмпамі. Парт'ячэйкі ня кіруюць гаспадарчым жыцьцём саўгасаў. Занаяўнасьці мае месца злачынная н падрыхтаванасьць многіх саўгасаў да веснавае сяўбы. Раённы камітэт партыі абвясьціў вымовы камуністым—кіраўніком саўгасаў **„Блонь“ „Цытва“** і інш. кіраўніку фэрмы с.-г. тэхнікуму.

Я.

Пазыка садзейнічаньня трактарызацыі сельскае гаспадаркі

МАСКВА. ЦВК і СНК СССР дазволілі Усесаюзнаму аб'яднаньню агульна-трактарнае прамысловасьці выпусьціць выйгрышную «пазыку садзейнічаньня трактарызацыі сельскае гаспадаркі», аблігацыі якой выплачваюцца ўтульсырцом, каторы паступае ў асобны фонд, прызначаны для дадатковага ўвозу трактараў з-за граніцы. Пазыка выпускаецца на суму 25.000.000 руб. 5-ірублёвымі аблігацыямі. Пазыка выпускаецца тэрмінам на 3 гады, да 15 лютага 1933 году. Штогодна будзе праводзіцца адзін тыраж з розыграшам у 30.000 выйгрышаў па 50 руб. кожны. Выйграўшая аблігацыя пагашаецца і выключаецца з наступных тыражоў. Трымальніку пазыкі, акрамя выйгрышу, выплачваецца каштоўнасьць аблігацыі. (ТАСС).

ПРЭМ'ЯВАНЬНЕ ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ

МАСКВА, 15. Праўленьне Трактарацэнтру рашыла ў пэрыяд веснавое пасеўнае кампаніі прэм'яваць трактарныя станцыі за лепшае выкананьне пасеўных работ. Трактарныя станцыі атрымліваюць па 50 трактараў у звыш выдзеленых па пэрспэктыўным плане.

Рост рэвалюцыйнага руху і посьпехі пяцігодкі—вось галоўная прычына антысавецкае кампаніі

Балдуін адкрыта дамагаецца разрыву з СССР

ЛЁНДАН, 15. У шырокіх колах «рабочае» партыі, урэшце, уявілі сабе **небясьпеку, якая пагражае ім самім** у выпадку посьпеху антысавецкай кампаніі кансэрватараў. Аспоўным артыкулам сёнешняга нумару **«Дэйлі Гэральд»** зьяўляецца **выкрыцьцё** — праўда, некалькі спозьненае, — **кансэрватыўнай інтрыгі,** захаванай паклёпніцкімі выдумкамі аб рэлігійных прасьледваньнях у СССР. Газэта паведамляе, што камітэт, які стаіць на чале антысавецкае кампаніі, складаецца галоўным чынам з кансэрватыўных лідэраў, даўно вядомых сваёй антысавецкай устаноўкай. Канстатуючы гэты факт, орган «рабочага» ўраду піша: «Сярод членаў парляманту з «рабочае партыі» заўважаецца вялікі непакой адносна дзіўных намаганьняў **клікі кансэрватараў выкарыстаць вышэйшых прадстаўнікоў царквы для ажыцьцяўленьня свае вялікарнае палітычнае эмовы.** Былы прэм'ер гэтымі днямі афіцыйна зьвязаўся з гэтаю клікай. Выдумка адносна мнімых рэлігійных прасьледваньняў у Расіі, якая зьявілася спачатку ў малавядомым і няўплывовым кансэрватыўным органе друку, прыняла ў апошнія дні шырокія разьмеры. Уся гэта агітацыя вядзецца пад кіраўніцтвам камітэту, у які ўваходзяць Джайнсон Хікс, лёрд Кэшэндэн, лёрд Вінтэртон, палкоўнік ГГрэтон і інш.

Адначасова газэта падкрэсьлівае, што ўсе вышэйпаказаныя асобы зьяўляюцца **лідэрамі кансэрватыўнай партыі,** а некаторыя з іх—**былыя члены габінэту.** Далей газэта спасылаецца на прэцэ

Усебеларускую сельска-гаспадарчую выстаўку адкрыць у тэрмін

Бюро ЦК КП(б)Б па пасяджэньні 15 лютага абгаворвала пытаньне аб ходзе работ па падрыхтоўцы да ўсебеларускае гаспадарчае выстаўкі. **Бюро ЦК пастанавіла, што выстаўка павінна быць адкрыта ў вызначаны тэрмін.**

Бюро прызнала, што дырэктывы аб узмацненьні работы па падрыхтоўцы да выстаўкі ня выкананы радам арганізацый (НКЗ, ВСНГ, спэцыяльныя віды с.-г. каапэрацыі і г. д.). Акруговыя камітэты дагэтуль не прынялі мер, каб праверыць работу акруговых арганізацый у галіне падрыхтоўкі да выстаўкі, не мабілізавалі ўвагі партыйных арганізацый.

У пастанове бюро асабліва падкрэслена недапушчальна марольная работа акруговых і раённых выставачных камітэтаў, што награжае зрывам падрыхтоўкі экспанатаў. Ваколі выстаўкі не мабілізаваны масы рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства.

Бюро ЦК даручыла дырэкцыі выстаўкі прыняць рашучыя меры, каб своечасова скончыць будаўнічыя работы.

Акруговым камітэтам партыі даручана ажывіць работу акруговых і раённых выстаўкомаў, устанавіўшы систэматычны кантроль за іх дзейнасьцю, мабілізаваць увагу ўсіх акруговых і раённых партарганізацый і вясковых ячэек да выстаўкі. ЦК ЛКСМБ даручана мабілізаваць увагу да выстаўкі ўсіх камсамольскіх арганізацый.

Бюро ЦК зацьвердзіла пастанову прэзыдыуму галоўвыстаўкому аб арганізацыі экскурсыйнага бюро пры ЦСПСБ. Менскаму АК і фракцыі ЦСПСБ запрапанавана зьвярнуць асаблівую ўвагу на абслугоўваньне экскурсантаў.

У сувязі з тым, што да адкрыцьця выстаўкі застаўся кароткі тэрмін, што патрабуецца выключная напружанасьць у рабоце ўсіх арганізацый і ў першую чаргу дырэкцыі выстаўкі, каб своечасова скончыць падрыхтоўку, бюро ЦК прызнала неабходным, каб дырэктар выстаўкому тав. Дубіна поўнасьцю перайшоў па работу ў выставачны камітэт, з вызваленьнем яго ад працы ў паляводсаюзе.

ЗАКРЫЎСЯ ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД АСОАВІЯХІМУ

Закрыўся другі ўсесаюзны зьезд Асоавіяхіму. Старшынёй Асоавіяхіму СССР выбраны тав. **А. І. Рыкаў**, яго намесьнікамі — т.т. **Н. А. Сямашка** і **І. С. Уншліхт.**

Закрываючы зьезд, т. Рыкаў у сваёй кароткай заключнай прамове падкрэсьліў неабходнасьць узмацненьня тэмпу работы Асоавіяхіму і выказаў упэўненасьць, што Асоавіяхім, які зьяўляецца бліжэйшым рэзэрвам Чырвонай арміі, на практыцы давядзе, што ён можа працаваць як у галіне мірнага будаўніцтва, так і ў справе абароны тымі тэмпамі, якія ўзяты зараз рабочаю клясаю Савецкае краіны.

З здавальненьнем тав. Рыкаў адзначыў на зьезьдзе заяву з боку прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый аб тым, што яны робяць рашучы паваарот у сваёй рабоце ў бок сапраўднага падтрыманьня Асоавіяхіму, што дасьць магчымасьць у далейшым гэтаму таварыству расьці яшчэ шырэйш. І калі Асоавіяхім цяпер у сваіх радах налічвае 5 мля. членаў, то пры дружным падтрыманьні прафэсаюзу і камсамолу наша таварыства вырасьце яшчэ больш.

Зьезд ухваліў пяцігадовы плян работы таварыства, што бязумоўна зьяўляецца фактам буйнога значэньня.

У рэзалюцыях зьезду адзначаецца, што ўся міжнародная і ўнутраная абстаноўка Савецкага Саюзу высоўвае перад Асоавіяхімам наступныя баявыя задачы: ваенную падрыхтоўку працоўных, актыўны ўдзел членаў т-ва ў рабоце па індустрыялізацыі і хэмізацыі краіны, у пасьпяховым ажыцьцяўленьні задач калектывізацыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, у справе падрыхтоўкі новых кадраў будаўнікоў сацыялізму. Зьезд асабліва падкрэсьліў важнасьць падрыхтоўкі працоўных да паветрана-хэмічнай абароны тылу.

Зьездам выбраны Цэнтральны Савет Асоавіяхіму ў складзе 167 чалавек.

Зьезд пастанавіў хадайнічаць перад ЦВК СССР **аб узнагародзе Амурскай рэчнай флётыліі ордэнам Чырвонага Сьцягу.**

Нафтаправод Баку—Батум пушчаны ў рух

Пралетарыят СССР атрымаў яшчэ адну перамогу на сацыялістычным фронце

13-га лютага а 6 гадз. веч. на бакінскай перапамповачнай станцыі нафтаправоду адбылося ўрачыстае адкрыцьцё перапампоўкі нафтаправоду Баку—Батум.

На адкрыцьці прысутнічалі пралетаўнікі Заккрайкому УсеКП(б), УсеЦСПС, ЗакЦВК, Закпрафсавету і т. д.

Старшыня Закаўкаскага ЦВК т. **Міха Цхакая**, перарэзаўшы чырвоную істужку, адкрыў рэзэрвуар № 6.

Тав. Цхакая сказаў: «Справа зроблена. Яшчэ адна буйная перамога ня толькі бакінскага пралетарыяту, але і пралетарыяту ўсяго Саюзу. Бакінская нафта праз Баку—Батумскі нафтапровод ільлецца па ўсім сьвеце».

На мітынгу, які адбыўся, з прывітаньнем выступіў сакратар Азэрбайджанскай кампартыі тав. Рахманаў. «Сёньняшняя перамога бакінскага пралетарыяту, —сказаў ён,—дасьць нам упэўненасьць, што мы ліквідуем прарывы ў прамысловасьці і выканаем на ўсе 100 проц. тыя задачы, якія ўскладзены на бакінскі пралетарыят».

Ад імя закпрафсавету выступіў тав. Кузьняцоў, ад УсеЦСПС тав. Сянюшкін, ад саюзу гарнякоў тав. Ярмохін і інш.

Кіраўнік трэстам Азнафты т. Барыкаў адзначыў, што гэраічнымі намаганьнямі рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу Азнафтбуду нафтапровод пабудован у такі тэрмін, у які ня будуюць нават у Амэрыцы.

Паводле прапановы рабочых нафтаправоду узьнята хадайніцтва аб узнагародзе галоўнага будаўніка нафтаправоду тав. Булганава ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

Вялікі рост ударніцтва

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 13. На працягу студзеня колькасьць ударных брыгад на «Чырвоным Сормове» амаль падвоілася. Да 10-га лютага на заводзе працуе 611 брыгад, у якіх прымаюць удзел 7.700 рабочых, 24 камуны аб'яднані 177 рабочых.

***

ХАРКАЎ, 15. Ленінскі набор ударнікаў на Украіне праходзіць нездавальняюча. З 600.000 індустрыяльных рабочых, якія налічваюцца на Украіне, у ленінскія ўдарныя брыгады ўцягнута ня больш 90.000.

Кан'юнктура народнае гаспадаркі БССР

за першы квартал 1929-30 г.

Вынікі работы рэспубліканскай прамысловасьці характарызуюцца вельмі нездавальняючымі паказальнікамі, асабліва ў галіне якасьці работы. Прадукцыя прамысловасьці, даўшы рост параўнаўча з першай квадрай мінулага году на 63,7 проц., аднак, склала толькі 20 проц. гадавога пляну. Прадукцыйнасьць працы ўзрасла на 28,3 проц. супроць першай квадры 1928-29 году і толькі на 5,8 проц. супроць IV квадры мінулага году. Зьніжэньне сабекошту дало прыблізна 5 проц. супроць 11 проц. па пляне, што пазбаўляе прамысловасьць капіт 4 млн. руб. і ставіць пад пагрозу выкананьне пляну капітальных работ. Таксама першая квадра 1929-30 году дала пагоршаньне якасьці прадукцыі па радзе галін выторчасьці. Ацэнка дасягнутых вынікаў работы прамысловасьці сведчыць аб тым, што прамысловасьць разгортвала сваю дзейнасьць у парадку самацёку і не прыняла яшчэ належных мерапрыемстваў для забесьпячэньня выкананьня пляну на 1929-30 год. Не праведзена фактычна ў жыцьцё дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб дэзінаначальні, не скарыстаны ўздым рабочае клясы, ня створана належная працоўная абстаноўка на прадпрыемствах.

Побач з інтэнсыўным разгортваньнем калгаснага руху першая квадра адзначыла адмоўнае зьявішча штучнага скарачэньня радам сялянскіх гаспадарак сваёй маемасьці, што знайшло свой адбітак у масавым забоі жывёлы. Гэта адмоўнае зьявішча выклікана новым маневрам з боку кулацкіх пластоў вёскі, накіраваным на зрыў працэсу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. З боку адпаведных гаспадарчых установаў і мясцовых савецкіх органаў ня быў своечасова даны рашучы адпор шкодніцкім дзеяньням кулацкіх пластоў вёскі і ня была праведзена адпаведная ўвага да фактаў рас продажу жывёлы.

Ня была выканана ў першай квадры адна з важнейшых частак гаспадарчага пляну на 1929-30 год,—зьніжэньне бюджэтнага індэксу, які нават даў павышэньне супроць 1928-29 г., што ўскладняе праблему павышэньня рэальнай заработнай платы на час, які застаўся. Спажывецкая каапэрацыя не праявіла належнае ўвагі да гэтага важнейшага заданьня, паказаўшы пасыўнасьць у выкананьні дырэктывы аб зьніжэньні бюджэтнага індэксу. Узровень цэн абагуленага сэктару даў нават некаторае павышэньне за першую квадру, а акоп рабочага бюджэту да гэтага часу знаходзіцца на вельмі недастатковай ступені.

З іншых галін народнае гаспадаркі зваручае на сябе ўвагу марудны тэмп выкананьня экспартнага пляну (13,3 проц. гадавое праграмы за першую квадру), што зьвязана з паслабленьнем увагі і актыўнасьці адпаведных гаспадарчых органаў да пытаньняў разгортваньня экспартных апэрацый як па лініі с.-г. тавараў, так і па лініі прамысловага экспарту.

Агульная ацэнка вынікаў першай часткі 1929-30 году паказвае поўную рэальнасьць і магчымасьць выкананьня ўсіх без выключэньня гадавых заданьняў кантрольных лічбаў. Недавыкананьне па асобных вучастках тлумачыцца зусім не аб'ектыўнымі фактарамі, наадварот, невыстарчальнай работай гаспадарчых, прафсаюзных і інш. арганізацый, ня прыняўшых неабходных мер, якія забясьпечваюць выкананьне пляну на 1929-30 год. Узрост сацыялістычнай самасьвядомасьці рабочае клясы ня быў скарыстаны для большага прыцягненьня найшырэйшых працоўных мас па шляху выкананьня пляну на другі год пяцігодкі. Пасьпяховае выкананьне пляновых заданьняў немагчыма бяз шырокай папулярызацыі гэтых заданьняў сярод мас рабочых і працоўных, без ўцягненьня іх у актыўны ўдзел па ажыцьцяўленьні гаспадарчых планаў і без мабілізацыі ўвагі ўсіх партыйных, прафэсыянальных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый.

Той, хто зрывае беларусізацыю— дапамагае клясаваму ворагу

„Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы беларусізацыя зьяўляецца адным з асноўных сродкаў па ажыцьцяўленьні кіруючай ролі пралетарыяту да асноўных мас сялянства, была і заканаецца магутнай зброяй у змаганьні з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, расійскім, яўрэйскім і іншымі шавінізмамі"

(З пастановы бюро ЦК КП(б)Б).

Партыйныя дырэктывы--ў жыцьцё

XII зьезд КП(б)Б у сваіх пастановах сказаў: «Яшчэ больш узмоцненым тэмпам праводзіць беларусізацыю ў партарганізацыях, савецкім апараце, прафсаюзах, разьвіваць усямерна беларускую культуру, забясьпечваючы ня пралетарскі зьмест, і разьвіваць самую шырокую і настойлівую прапаганду сярод шырокіх рабочых мас за беларусізацыю, за аўладаньне і поўнае кіраўніцтва пралетарскай культурай, якая разьвіваецца, як адзнаго з буйнейшых сродкаў узмацненьня кіраўніцтва вёскі з боку рабочае клясы».

Здавалася, што ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы беларусізацыя зьяўляецца адным з асноўных сродкаў па ажыцьцяўленьні кіраўнічай ролі пралетарыяту асноўнымі масамі сялянства, што яна зьяўляецца «магутнай зброяй у змаганьні з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, расійскім і інш. шавінізмамі». І той, хто ад жывое справы беларусізацыі хоча адгарадзіцца штампам казёншчыны, той, хто не праводзіць у жыцьцё беларусізацыю, той дапамагае клясавым ворагам. Толькі так трэба ставіць зараз пытаньне.

Партыйным камітэтам і ячэйкам неабходна ўзмацніць сваю ўвагу на правядзеньне ў жыцьцё партыйных дырэктыў аб беларусізацыі. Трэба зараз-жа на справе ажыцьцявіць дырэктыву Бюро ЦК КП(б)Б аб прыцягненьні да партыйнай адказнасьці камуністых, якія, працуючы на ўстановах, не праводзяць на справе беларусізацыі ў апараце.

Праводзячы беларусізацыю на падставе правільнай партыйнай лініі, вядучы непрымірымую барацьбу в беларускім нацыянал-дэмакратызмам, расійскім, яўрэйскім і іншымі шавінізмамі — партарганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу па інтэрнацыянальным выхаваньні мас.

С.

Пішуць пабеларуску, а гавораць па расійску

У савецкім апараце Аршаншчыны існуе не беларусізацыя, а мешаніна. Справаводзтва праводзіцца на беларускай мове, а гавораць парасійску.

У апараце акрвыканкому справаводзтва вядзецца на беларускай мове, некаторыя адказныя і тэхнічныя працаўнікі, інспэктарыят асьветы і сакратарыят акрвыканкому гавораць пабеларуску. Інжынэрна-тэхнічны склад апарату, большасьць служачых беларускае мовы ня ўжываюць.

Аптэкакіраўніцтва, аддзел аховы здароўя, усе лекавыя установы, міліцыя, акрфа, акрсельсаюз, пракуратура, акрбеларускай мове, але ў гутарках ёй таксама не карыстаюцца. **З 324 працаўнікоў ЦРК толькі 6 чал. ведаюць беларускую мову**

Трэба ўзмацніць тэмп беларусізацыі савецкага апарату на Аршаншчыне.

А. ЗОРКІ.

Беларусізацыю праводзяць машыністкі

Тэрміны для беларусізацыі апарату Гомельшчыны былі даны досыць вялікія. Усё-ж на сёньняшні дзень беларуская мова ў значнай частцы акруговага і раённага апарату ня ўжываецца. У большасьці акруговых установаў (АВК, райсаюз, акрза і інш.) гавораць паміж сабою выключна на расійскай мове.

Паперкі абежнікі (ва ўстановах, у АПБ) пішуцца адказнымі працаўнікамі на расійскай мове, але в установы выходзяць на беларускай, дзякуючы машыністкам, якія пры дапамозе слоўнікаў беларусізуюць установу.

У асобных-жа раёнах справа абстаіць яшчэ горш. Так, напрыклад, у Хойніках райвыканком вядзе ўсю перапіску па расійскай мове. Нават больш таго, асобныя настаўнікі ў школах правялі выкладаць беларускую мову на расійскай мове. У Хойніках ёсьць райаграном, які паўгода таму назад скончыў беларускую с.-г. акадэмію у Горках. Калі-ж у яго запыталі, як у раёне пастаўлена масава-выхаваўчая работа ў калгасах, дык ён запытаў: «А что это такое «выхаваўчая», а пасьля дадаў: «Какое смешное слова»!

УЛЬ. ЭЛЬ.

БУДЗЕМ ПІЛЬНА ГЛЯДЗЕЦЬ НА ЗАХАД!

Усе сілы міжнароднага капіталу мабілізаваны для шалёнага ўкаваньня Савецкага Саюзу. Велагвардзейская сволач і рымскі папа, французкая буржуазная прэса і «рабочы» міністар «его величества» Тэндэрсон, амэрыканскія імпэрыялісты і нямецкая буржуазія — усе гэтыя крыжакі сусьветнай контр-рэвалюцыі выступаюць адзіным антысавецкім фронтам пад сьцягамі падрыхтоўкі новага паходу на краіну Саветаў.

Нашы буйныя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва прыводзяць у шаленства міжнародную буржуазію і не верных паслугачоў — сацыял-фашыстых усіх нацыянальнасьцяй і колераў. Нераможны рух наперад нашай пяцігодкі выклікае трансталіны жах капіталістычных уладароў, пад нагамі якіх усе мацней і ўсё выразней хістаецца грунт. Ліквідацыя кулацтва, як клясы, выбівае і зьнішчае апорныя сілы сусьветнага імпэрыялізму ў СССР і нараджае ў яго аспрэдзінчы зусім для нас зразумелае дзікае і злоснае шыцьцё. Пад відам «абароны рэлігіі», якая быццам «праследуецца» савецкім урадам, пад відам дзікіх куцепаўскіх вымыслаў палымяцца сьцяг «маральнай» інтэрвэнцыі, якая адкрыта рыхтуе эканамічную блёкаду і новую ўзброеную інтэрвэнцыю. Ва ўсіх краінах, нават такіх, як Нямеччына, падымае галаву самая рэакцыйная, найбольш антысавецкі настроеная частка буржуазіі, якая і становіцца на чале завастрэньня антысавецкай палітыкі буржуазных дзяржаў. І ў першых радах сусьветнай рэакцыі крочыць 11-гі Інтэрнацыянал і яго крывавыя гэрої, тэтыя шаленствуючыя ворагі пралетарскай дыктатуры.

Уся гэта нябачная на сваёй дзікасьці і шалонстве кампанія адбываецца на фоне глыбокага ўнутранога крызісу ў капіталістычных дзяржавах, на фоне ўзрастаючага рэвалюцыйнага руху рабочай клясы і прыгнечаных народаў каленій. «Здань камунізму» стала тэй бальшавіцкай лавінай, ратаваньне ад якое моліць у бога рымскі папа, ратаваньня ад якое буржуазія і II-гі Інтэрнацыянал шукаюць у кулямётным агні супроць рабочых дэманстрацый і дзікага ўкаваньня сацыялістычнай, пралетарскай дзяржавы.

Фашысцкая Польшча — наш найбліжэйшы сусед тэты авангардны атрад сусьветнага капіталу — таксама ахоплена новай хваляй антысавецкай кампаніі. Куцепаў і куцепаўшчына ня зыходзяць са старонак польскай фашысцкай і сацыял - фашысцкай прэсы. Самыя непраўдаподобныя вымыслы аб «ахвярах чырвонага тэрору», аб «рэлігійных праследаваньнях» напаўняюць усе бульварныя, урадовыя, сацыял - і нацыянал - фашысцкія газэты. Адозва рымскага папы выклікала ў польскай прэсе, асабліва ў віленскай, дзікую сьвістапляску, накіраваную супроць Савецкага Саюзу

Мы ўжо зварачалі ўвагу на яўна антысавецкі характар падарожжа ў Польшчу эстонскага прэзыдэнта Штрандмана і ўсіх тых урачыстасьцяй, якія адбываліся ў Польшчы ў сувязі з гэтым падарожжам.

У сойме прадстаўнікі ўрадовага блёку выступаюць з правакацыйнымі антысавецкімі прамовамі. Урадовы афіцыёзіёз «Газэта Польска» з поўнымі мэтамі займаецца пытаньнем аб савецка - нямецкіх адносінах, падкрэсьліваючы «амрок расальскага трактату». Вялікі працэс ППС-лявіцы, які адбываецца, выкарыстоўваецца судом для правакацыйных выпадаў супроць Савецкага Саюзу і савецкіх прадстаўнікоў за межамі.

Польскія сацыял-фашыстыя, як і іх браты — беларускія і украінскія нацыянал - фашыстыя, **ідуць на чале** антысавецкага ўкаваньня, натхняючы самыя брудныя і нахабныя выпады супроць савецкае краіны.

Адначасова з гэтым, мы заўважваем ліхаманкавыя падрыхтаваньні да вайны, узрост ваеннага бюджэту, адкрыцьцё новых хэмічных фабрык, узмацненьне ваенных сувязяй з Францыяй і Румыніяй, актыўныя спробы скалачыць антысавецкі блёк прыбалтыцкіх краін.

Фашысцкая Польшча яшчэ ў большай меры, чым усе іншыя буржуазныя дзяржавы, **перажывае глыбокі крызіс.** Гаспадарка Польшчы зайшла ў тупік. «Стабілізацыя» трашчыць па ўсіх швох. А разам з гэтым, **падымаецца магутная хваля рэвалюцыйнага руху рабочае клясы, працоўнага сялянства і прыгнечаных народаў пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі Польшчы.** Адгэтуль—узмацненьне падрыхтовак да вайны, як выхаду з цяжкога становішча. Адгэтуль —стараннае выкананьне загаду міжнароднага імпэрыялізму аб узмацненьні антысавецкага ўкаваньня. Адгэтуль—шалёная кампанія на адрасе ўзрастаючых Беларускай і Украінскай Савецкіх Рэспублік, рэвалюцыйны ўплыў якіх ідзе на шырокія працоўныя масы Зах. Беларусі, Зах. Украіны і ўсёй Польшчы.

Савецкі ўрад нязьменна вёў і будзе весьці палітыку міра. Але працоўныя нашай краіны, працоўныя БССР, якая знаходзіцца на ўзьмежжы капіталістычнага сьвету, перад абліччам гэтай новай антысавецкай кампаніі павінны ўсямерна ўзмацніць сваю пільнасьць. Лепш прапанаць, цьвёрда праводзіць генэральную лінію сацыялістычнага будаўніцтва і быць на варце! Пільна сачыць за кожным рухам ворага! А вораг няхай ведае, што кожная спроба парушыць нашу мірную працу **сустрэне жалезную сьцяну працоўных пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, якія здолеюць нанесьці руйнуючы ўдар па ворагу.** Нас ня ўзрушаюць гістэрычныя скавытаньні сацыял-фашыстых і палоўскіх клікуш усяго сьвету. Мы будуем сацыялізм, мы вядзем мірную палітыку, але **кожная спроба сарваць нашае будаўніцтва скончыцца крахам для клясавага ворага.**

Надыходзячая гадавіна Чырвонай арміі пройдзе пад знакам узмацненьня абароназдольнасьці савецкай краіны. Яна яшчэ раз пакажа, што працоўныя масы БССР гатовы, як адзін, стаць на абарону сваёй пралетарскай, сацыялістычнай дзяржавы.

АПОШНЯЯ МАСКОУСКІЯ ПАДЗЕІ

(Ад нашага карэспандэнта)

ІНСПЭКЦЫЙНАЯ ПАЕЗДКА ЧЛЕНАЎ УРАДУ

Для інспэкцыі работы па падрыхтоўцы да вясны выехалі на месцы т. т. КАЛІНІН, МІКАЯН, ЯКАЎЛЕЎ, АРДЖАНІКІДЗЕ. Выехаў таксама сакратар ЦК УсеКП(б) т. КАГАНОВІЧ.

ЗАВОДЫ — ВНТУ Ў ХАРКАВЕ І МЕНСКУ

Галоўнтэхнаўка пры ВСНГ СССР пастанавіў у мэтах паскарэньня падрыхтоўкі кадраў сацыялістых адчыніць заводы—ВНТУ **ў Харкаве і Менску.** Частка сродкаў і кіраўніцтва будзе дана цэнтрам. У бліжэйшым годзе маркуецца таксама стварыць сетку заводаў - тэхнікумаў. **Адзін з іх мяркуецца адчыніць у Віцебску.**

МУНІЦЫПАЛІЗАЦЫЯ ДАЧ

Маскоўскі Савет пастанавіў у гэтым годзе канчаткова ліквідаваць прыватнае ўладаньне дачамі, як сродкам наяжывы. Усе дачы, якія здаюцца арандатарамі за плату, будуць забраны ад арандатараў і перададзены дачнаму трэсту. Спэкуляцыя дачамі будзе спынена. **Гэта мера закранае звыш 2.000 падмаскоўных дач.** З гэтага часу яны будуць здавацца ў першую чаргу рабочым калектывам. Мяркуецца, што уся Маскоўская вобласьць пяройдзе на новага парадку эксплёатацыі дач.

ВЫЯЗНЫЯ РЭДАКЦЫІ З ПАХОДНЫМІ ДРУКАРНЯМІ Ў РАЁНЫ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

СМАЛЕНСК, 16. Абласныя газэты выслалі ў раёны суцэльнай калектывізацыі 4 выязныя рэдакцыі з паходнымі друкарнямі для выпуску друкаваных газэт. У Вяземскім раёне, Вяземскае акругі, выпуск друкаванай газэты «За калектывізацыю» выклікаў вялізны ўздым сярод кулакоў і бедняко́ў. Калгасьнікі абмеркавалі 1-га сакавіка скончыць калектывізацыю раёну і ў працягу 5 дзён абагуліць усе сродкі вытворчасьці калгасаў. У раёне ствараюцца тры машына-конныя станцыі.

Мазыршчына--акруга суцэльнае калектывізацыі

80 проц. зямельнае плошчы Мазыршчыны—пад калгасамі. Калектывізацыя адкрывае перад Мазыршчынаю вялізарныя пэрспэктывы для далейшага разьвіцьця гаспадаркі. Пралетарскія цэнтры, на дапамогу Мазыршчыне!

Паводле сацыялістычнага дагавору, падпісанага Менскай і Мазырскай акругамі, апошняя абавязвалася калектывізаваць на 100 проц. чатыры раёны—Юраўніцкі, Калінкавіцкі, Каралінскі і Тураўскі. На 5-га лютага Мазыршчына гэтае заданьне ўжо далёка перавысіла. Зазначаныя чатыры раёны ўжо кажучь 100 проц. калектывізацыю. Але апрача гэтых 4-х раёнаў праводзіцца суцэльная калектывізацыя і па іншых раёнах Мазыршчыны. Так, у Жыткавіцкім раёне на 10-га лютага было калектывізавана 95 проц. усяе зямельнае плошчы, у Пятрыкоўскім—74 проц. і г. д.

На 10-га лютага па ўсёй акрузе калектывізавана 80 проц. усяе зямельнае плошчы.

Ёсьць усе падставы лічыць, што суцэльная калектывізацыя на Мазыршчыне да вясны будзе поўнасьцю скончана.

Вялізныя пэрспэктывы гаспадарчага разьвіцьця

Суцэльная калектывізацыя адкрывае перад Мазыршчынай такія пэрспэктывы гаспадарчага разьвіцьця, якіх ня ведае, напэўна, ні адна акруга БССР.

Вялізныя масывы балот, якія зьяўляюцца многамільённай каштоўнасьцю і не давалі да апошняга часу ніякае карысьці, **зараз будуць уцягнуты ў гаспадарчую сфэру.** Ужо сёлета ў Мазырскай акрузе Малізембуд пачынае буйнейшыя работы на мэліярацыі балот, таму сюды прыбывае каля 750 спэцыялістых па мэліярацыі.

Лясныя багацьці акругі пры арганізацыі правільнай распрацоўкі іх таксама змогуць даць значна больш прыбытку, чым да апошняга часу. Урэшце, калі ўлічыць, што заканчэньне пабудовы Дняпрабуду зьвяжа Мазыршчыну, багатую лесам з бязьлесным поўднем непасрэдна водным шляхам «Прыпяць —Дняпро», то стане ясным, што пэрспэктывы разьвіцьця Мазыршчыны вялізарныя.

Перад рашучым боем

Пасеўная кампанія гэтага году—гэта рашучы бой старым мэтадам гаспадараньня ў вёсцы.

Таму зусім натуральна, што ўвага ўсёй Мазыршкай партарганізацыі згуртавана на пасеўнай кампаніі. Апошняя заключаецца ня толькі ў тым, што ствараюцца пасеўныя фонды. Праўда, фонд—асноўнае пытаньне, але не адзінае.

Вялікае значэньне, апрача яго мае падрыхтоўка інвэнтару і цягавай сілы. У большасьці раёнаў інвэнтар ужо абагульваецца. Але з прычыны недахвату кавалёў і рамонтных майстэрань, гэты інвэнтар рамонтуецца несваячасова. Мазыр з яго нязначнай прамысловасьцю ня можа вылучыць патрэбнае колькасьці перасоваўчых кузьняў. І вось у гэтай справе павінны прыйсьці на дапамогу больш прамысловыя цэнтры—Гомель, Менск, накіраваўшы хоць-бы па адной такой кузьні на кожны раён Мазыршчыны.

Пытаньне аб падрыхтоўцы да сяўбы цягавай сілы таксама зьвязана з пытаньнем абагуленьня жывёлы. У большасьці калгасаў Мазыршчыны чакаюць падыходу цяплейшага надвор'я для пабудовы новых хлявоў для абагуленае жывёлы. Гэтае чаканьне прыносіць шкоду. Таму зусім правільна паступілі некаторыя калгасы Жыткавіцкага раёну, якія выдзелілі ўсе лепшыя ў вёсны стайні і, не чакаючы надвор'я, паставілі туды ўсіх абагуленых коняй, прызначыўшы адказных людзей наглядаць за імі.

Арганізацыя работы і аплаты —ў цэнтры ўвагі

Важнейшым пытаньнем для работы калгасаў наогул і для посьпеху пасеўнае кампаніі зьяўляецца арганізацыя працы і аплаты. Ужо зараз адсутнасьць яснасьці ў гэтым пытаньні дае сябе адчуваць. Для прыкладу можна падаць рад фактаў, калі адсутнасьць арганізацыі працы і аплаты значна зьнижала прадукцыйнасьць работы. У Жыткавіцкім раёне сяляне-калгасьнікі за возку лесу зарабілі ў два-тры разы менш, чым у мінулым годзе. Выйшла гэта таму, што праўленьне калгасу пастанавіла: «сёньня ўсе возьць сена, заўтра ўсё возьць лес»—без усялякага вызначэньня нормаў для аплаты работы.

Некалькі лепш гэта справа была арганізавана ў Юраўніцкім раёне, дзе пастанавілі 20 проц. заработку адлічаць у фонд калгасу, а рэшту выдаваць на рукі. Але і гэта бязумоўна ня выхад са становішча. Найбольш правільнай зьявілася-б расцэнка кожнага віду работы з вызначэньнем прэмій за якасьць і надбаўкі за колькасьць. Але практыка гэтае работы зусім адсутнічае. Калгасцэнтру трэба было-б ад агульных установак перайсьці да дачы канкрэтных паказальніку, распрацаваўшы прыкладную схему аплаты і разьмеркаваньня работы хоць-бы ў адным калгасе і накіраваўшы папулярную прыкладную літаратуру ў калгасы.

Саветы і калектывізацыя вёскі

Яская роль сельсаветаў у рабоце па калектывізацыі вёскі? Трэба сказаць, што да апошняга часу гэта роля была нязначная. Большасьць сельсаветаў, якія прызвычаіліся выконваць работу па заданьнях раёну і лічылі асноўнай сваёй работай, галоўным чынам, зьбіраньне падатку, страхоўкі, самаабкладаньня, ня справіліся з задачай кіраўніцтва калектывізацыяй, а тым больш справаю кіраўніцтва ўжо арганізаванымі калектывамі, якія патрабуюць большай ініцыятывы і арганізаваных мэтадаў работы.

Сельсаветы, якія яшчэ ня здолелі стаць на чале калектыўнага руху, можна падзяліць зараз на тры катэгорыі: першае — пасыўныя сельсаветы, якія ўсё яшчэ стаяць у баку ад калектыўнага руху. Другі сельсаветы, якія ха целі нешта рабіць, але ня ўмеюць узяць ініцыятыву ў свае рукі і трэцяе — сельсаветы, якія прымаюць удзел у рабоце, але губляюць свой твар, як кіраўнічыя органы.

Сельсаветаў першае катэгорыі зараз засталося мала і лік іх з перавыбарамі напэўна дойдзе да нуля.

Сельсаветы трэцяй катэгорыі вылучыліся ў апошні час іменна ў тым, што старшыні пласобных сельсаветаў сталі старшынямі праўленьняў калгасаў (Жыткавіцкі раён), і твар іх, як старшынь сельсаветаў, затушаваўся. Найбольшую-ж групу складаюць сельсаветы другой катэгорыі. Больш за ўсё слабыя сельсаветы ў гэтай катэгорыі прыкладаюць ня тым, што яны ня ўмеюць кіраваць, але пастаўць сваю работу. Дырэктыва ЦВК аб рэарганізацыі с.-г. камісій сельсаветаў у вытворчыя амаль ніадзе не праведзена ў жыцьцё. Тое-ж самае і ў адносінах арганізацыі камісій па паляпшэньні быту жанчын, ня глядзячы на вялізныя задачы гэтых камісій асабліва ў сувязі з скасаваньнем жанадзелу. Ёсьць яшчэ сельсаветы, дзе не аформлена ні адна камісія. Большасьць сельсаветаў працуе без пляну, некаторыя ўжо — на працягу 6-7 месяцаў.

Адначасова з перавыбарамі неабходна правесьці і ўзбуйненьне сельсаветаў. Пытаньне аб узбуйненьні трэба паставіць ня толькі там, дзе калгас ахапляе некалькі сельсаветаў, але і ў іншых мясцох. Гэта дало-б магчымасьць палепшыць кадры савецкіх работнікаў і разам з тым кіраўніцтва.

Клясавыя ўзаемадносіны ўнутры калгасаў

Калі па меры ўзмацненьня калгасаў розьніца паміж бедняком і серадняком паступова будзе трацица, то цяпер асабліва ў новых калгасах клясавыя супярэчнасьці няўхільны, бо там яшчэ ёсьць перажыткі індывідуалістычнай або нават кулацкай псыхалёгіі, там яшчэ ёсьць некаторая няўроўнасьць.

У чым-жа гэтыя супярэчнасьці выяўляцца. Папершае, у пытаньні аб кіраўніцтве, інакш кажучы ў спробах адсунуць батрака і бедняка на задні плян; падрэтае, у адносінах да аграмаджаньня, калі бядняк імкнецца паскорыць яго, а моцны серадняк адцягвае яго пад розныя прычынамі; патрацяе, у разьмеркаваньні прадуктаў, у разьмеркаваньні тавараў каапэрацыі.

Напрыклад, пры разьмеркаваньні кажухоў, атрыманых з каапэрацыі, моцныя сераднякі ў калгасе «Чырвоны Баец», Юраўніцкага раёну, патрабавалі сабе па адным кажуху (хоць у іх і свае былі, а ў бедняко́ў ня было) таму, што яны, бачыце, больш унесьлі ў калгас.

На жаль, работнікі па мясцох часта не зварачаюць на гэтыя зьявішчы належнае ўвагі і не сьпяшаюцца з арганізацыяй і ўзмацненьнем груп бедняты ў калгасах. Толькі ў апошні час гэта работа за арганізацыі груп бедняты разгарнулася некалькі шырэй. Узмацненьне работы іх зьяўляецца ўсё яшчэ чарговай задачай бліжэйшага часу.

А. ВАЙЦОК.

Мазыр 14-га лютага.

СЕЛЬКОРЫ НА ВЕСНАВЫМ ФРОНЦЕ

Мільёны працоўных гораду і вёскі ўзяліся за сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі. Падрыхтоўка да веснавое кампаніі ў разгары.

Лепшыя пралетары-арганізатары кінуты ў вёску для дапамогі калектывізуючаму бядняцка-серадняцкаму сялянству.

Курс партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы, тэйкі шляхам самай шырокай калектывізацыі гаспадарак, а ня голым раскулачваньнем апрача сувязі з калектывізацыяй—павінен будзе знайсьці свой выраз ужо ў пэрыяд веснавое кампаніі. У гэту вялікую клясавую сьпрэчку трэба ўцягнуць самыя шырокія масы працоўных гораду і вёскі. Толькі пры гэтай умове будзе забясьпечана правільная ліквідацыя кулака.

Асаблівая роля ў пасеўнай кампаніі гэтага году выпадае на долю сельскораў і насьценгазэт. На сельскораў і пізаны друк ускладаецца вельмі сур'ёзная задача мабілізаваць бядняцка серадняцкую масу сялянства на барацьбу з кулацтвам, за правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі і ўрада аб перавозе вёскі на калектыўныя рэйкі.

Сельскорам і насьценгазэтам трэба паказаць перабудаваць сваю работу. Трэба самамабілізавацца. Трэба выступіць арганізатарамі мас у барацьбе за новую сацыялістычную вёску. Зрабіць гэта змогуць сельскоры і насьценгазэты толькі ў тым выпадку, калі яны самі добра зразумеюць задачы, пастаўленыя перад СССР у цэлым, і задачы, якія стаяць перад сваім раёнам, перад сваёй акрутай у прыватнасьці.

Калі сельскоры зразумеюць самі кожны пункт пасеўнага пляну свайго раёну, тады яны змогуць выпрац

ЗРЫВ ПЛЯНУ—УДАР ПА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Глушыцеляў рабочай ініцыятывы—на чорную дошку

Гаспадарнікі, якія ня выконваюць прапаноў рабочых і вытворчых нарад, якія ня прыслухоўваюцца да голасу рабочага калектыву—ня могуць стаяць на чале сацыялістычнага прадпрыемства

Вытворчыя нарады павінны мабілізаваць усіх рабочых на пасьпяховае выкананьне прамфінпляну і ўпарта змагацца за ажыцьцяўленьне кожнай дзелавой прапановы

Зводкі з фабрык і заводаў

БРЫГАДА—НА „ДНЯПРОЎСКУЮ МАНУФАКТУРУ"

Учора вечарам рэдакцыя атрымала ад Аршанскага акругкому наступную тэлеграму: «Акругкомам камандыравана на «Дняпроўскую Мануфактуру» брыгада з 5-ці адказных працаўнікоў з адпаведным даручэньнем».

Рэдакцыя просіць брыгаду неадкладна зьвязацца з ёю і сыстэматычна інфармаваць «Зьвязду» аб сваёй рабоце.

„ЭНЭРГІЯ" АДСТАЕ

Чырвона-штандартны завод „Энэргія" за першыя 10 дзён лютага выканаў прамфінплян на 92 проц. Прычынай недавыкананьня прамфінпляну зьявілася тое, што мэханічны цэх значна адстаў. Па гэтым цэху заданьне выкананa толькі на 81 проц. Паводле пляну ён павінен быў за 10 дзён лютага выпусьціць прадукцыі на 36.540 р., выпусьціў-жа ўсяго на 29.452 руб.

Вагавы і ліцейны цэхі перавыканалі сваю праграму—першы на 12 проц., другі—на 17 проц.

Г.

ДЫРЭКТАРА КАРАСІКА да АКДАЗНАСЬЦІ

Ліст ударнікаў лесазавду „Калектыўная Праца"

«Мы заключылі ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва гаспадарча-палітычнага дагавор, паводле якога мы ўзялі на сябе рад абавязкаў. Але без падтрыманьня заводакіраўніцтва мы гэтых абавязкаў ня выкапаем. Заводакіраўніцтва па дагаворы абавязалася забясьпечваць нас бесьперабойна сырцом добрай якасьці і іншымі патрэбнымі матар'ялямі.

Мы, барабаншчыкі і фугаўшчыкі бачарнага цэху, арганізавалі ўдарную брыгаду і **добраахвотна зьнізілі расцэнкі**, ушчыльнілі свой рабочы дзень і, у сувязі з перагрузкай парасілавой гаспадаркі і каб унікнуць тэхнічных спыненьняў, **добраахвотна згадзіліся перайсьці працаваць на ўсю зіму ў трэцюю зьмену**, г. зн. з 11 гадз. увечары да 7-мі гадзін раніцы. Гэтым самым мы ўсялякі спрыяем пасьпяховаму выкананьню сацыялістычнага дагавору. Але з боку адміністрацыі, у прыватнасьці, **дырэктара Карасіка і расьпілоўшчыка Шыфрына** наглядаюцца **злачынныя адносіны да вытворчасьці**, што зрывае выкананьне саддагавору. Адміністрацыя не прыслухоўваецца да дзелавых прапаноў рабочых нашага цэху, а таксама цэхавай вытворчай камісіі.

Вытворчая камісія паведаміла заводакіраўніцтва, што трэба тэрмінова даставіць сырэц, які ляжыць на беразе, бо з наступленьнем халадоў, сырэц дасьць меншую прадукцыйнасьць і папсуе пілы. Але заводакіраўніцтва на гэту прапанову не зьвярнула ўвагі.

Па віне адміністрацыі некалькі вагонаў бачарных дроў былі васьпаны пяском, што зрабіла больш цяжкім распрацоўку іх, бо кожныя 15 мінут прыходзілася столькі-ж часу траціць, каб натачыць пілы. Пры гэтым 18 дапаможных рабочых нічога не рабілі.

Пры розцы дроў, забруджаных пяском, палатно барабану хутка зношваецца. Выходзячы з гэтага, мы, барабаншчыкі, знайшлі, што гэтыя дровы з пяском больш мэтазгодна прадаць рабочым на апал. Але і гэта прапанова ня была праведзена заводакіраўніцтвам у жыцьцё. Наадварот, дровы з пяском былі паданы для распрацоўкі разам з добрым сырцом, што моцна адбілася на рабоце.

Нашы штодзенныя напамінаньні расьпілоўшчыку Шыфрыну і дырэктару Карасіку аб лепшым забесьпячэньні нас сырцом не дапамагалі, нас усё-ж забясьпечвалі не на поўную зьмену і ў выніку мы мелі штодзенныя прастоі цэху па 2-2½ гадз.

На нашу прапанову паставіць яшчэ адну фурманку для падвозкі сырцу расьпілоўшчык Шыфрын не зьвярнуў увагі, а дырэктар Карасік супакоіў нас тым, што «вам за прастоі заплацяць», забываючы, што **нас плата за прастоі ня цікавіць, а цікавіць зьнішчэньне саміх прастояў.**

Для ачысткі сырцу ад пяску мы прапанавалі паставіць спэцыяльнага чалавека, але і гэта ня было праведзена. У выніку мы на прастоях барабана страцілі 13 руб. у той час, як аднаму рабочаму прышлося-б заплаціць толькі 2 руб.

З-за дрэннасьці сырцу і другіх прычын, якія не залежаць ад рабочых, пілы **па двух барабанах адклеіваліся**, у сувязі з чым працаваць на барабанах стала **небясьпечна**. Аб гэтым мы ня раз заўважалі адміністрацыі і мэханіку **Мадорскаму**, якія нас супакойвалі тым, што нас хутка перакідваюць у Рэчыцу на лесазавод імя Томскага. Гэта «хутка» цягнулася некалькі тыдняў. У сувязі з такім рэагаваньнем на рабочыя прапановы мы па бачарнаму цэху маем **амаль 50 проц. недавыпрацоўкі.**

Хаця сапраўды наш цэх перакідваецца ў Рэчыцу, але ўсё-ж мы просім РСІ занядба гэтаю справаю і даць моцна па руках тым, хто заціскае рабочую ініцыятыву і ня выконвае дзелавых рабочых прапаноў. Між іншым, усё гэта вядома бюро парткалектыву і заўкому, але яны ніякіх мер ня прымалі.

Ударнікі: **Сыркін, Самарын, Яновіч, Самарын Р., Палякоў, Пастухоў, Кацуба.**

Каштоўныя прапановы ня выконваюцца

Колькі не таварылі аб выкананьні рабочых прапаноў, а справа застаецца пастарому. У **Бабруйску**—тое самае, што і ва многіх іншых мясцох.

На дрэваапрацоўчым камбінаце з 7 прапаноў за першы квартал, праведзены ў жыцьцё толькі 3. На чыгуна-ліцейным заводзе прапановы аб пабудове вэнтыляцыі ў кузьні і ліцейным цэху ня выкананы.

На мэблевай фабрыцы няма нават уліку рабочых прапаноў. Ня ведае аб іх і старшыня вытворчай камісіі. Між тым, на мэблевай фабрыцы ёсьць рад цікавых прапаноў рабочых і нават выпадкі, але да іх наглядаюцца вельмі пядбайныя адносіны. Так, выпадкова т. **Рабкіна** марынавалася каля паўгода. 21-га лістапада мінулага году ў вытворчую камісію паступіла выпадкова рабочага **Умана**, які прапанаваў варыянт для паліроўкі царгаў. Гэты варыянт напярэдадні-бы шмат выпадкаў захворваньняў на экзэму пры ручной паліроўцы. Камісія даручыла тэхнолёгу Увядэмскаму дэтальна распрацаваць праект і падаць яго на наступнае пасяджэньне камісіі. Прайшло 3 з паловай месяцы, а аб выпадковы нічога ня чуваць.

Кіраўніком бабруйскіх прадпрыемстваў трэба рашуча зьмяніць свае адносіны да рабочых прапаноў.

А. МАГІДАЎ.

Ламаюцца пілы

Адміністрацыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» (Менск) ня ажыцьцёвіла раду пастаноў апошняй вытворчай нарады. Невыкананьне некаторых прапаноў **пагражае заводу зрывам працы.** Напрыклад, у бярвеньнях, што ідуць у расьпілоўку, сустракаецца шмат цьвікоў, аб якія ламаюцца пілы. Вытворчая нарада прапанавала адміністрацыі паставіць аднаго рабочага на агляд бярвеньняў. Але адміністрацыя гэту прапанову ня выконвае. Таксама адміністрацыя адмовілася паставіць рабочага на абкорку бярвеньняў.

Прапановы рабочых пад сукном

(Фабрыка „Беларуска", Менск)

У пляне работы вытворчай камісіі ёсьць пункт: «вывесіць у кожным цэху спыткі для запісваньня прапаноў рабочых». Але, на жаль, гэты пункт ня выконваецца. З 12 аддзяленьняў толькі ў 4-х ёсьць спыткі, у іншых няма. А там, дзе спыткі ёсьць і дзе запісаны рабочыя прапановы, апошнія таксама застаюцца бяз вынікаў, бо імі ніхто ня цікавіцца.

Рабочыя рагавога цэху па вырабе гузікаў унесьлі прапанову, каб галаліт, які падаецца для работы, замочвалі на некалькі дзён раней, каб ён быў мякчэй. Гэта ня выконваецца. Галаліт замочваецца перад тым, як яго прыносяць у цэх, і рабочыя прымушаны яго цускаць у ход цьвёрдым—адсюль невыстарчальная прадукцыйнасьць працы.

Гузікі розных лініяў зьмешваюцца і шмат часу ідзе на сартаваньне. Таму прадукцыйнасьць працы работніц зьмяншаецца на 50 проц.

Для падачы грэбняў з аднаго аддзяленьня ў другое не хапае скрынак. Работніцы прымушаны бегаць па аддзяленьнях і шукаць скрынкі. На гэта таксама ідзе шмат часу. У сартавальні для клейкі грэбняў не хапае клею. Клей купляецца па аднэй маленькай бутэльцы, замест таго, каб купіць адразу некалькі ў запас.

У мыечным аддзяленьні няма сушылкі для грэбняў. Грэбні сушацца на трубах паравога ацяпленьня. Таму часта здараюцца затрыманьні, бо грэбні не пасьпяваюць высыхаць.

Усе гэтыя недахопы б'юць па прадукцыйнасьці працы і выкананьні прамфінпляну. Аб зьнішчэньні гэтых недахопаў ёсьць рад прапаноў рабочых, але яны ня выконваюцца.

М. Ц.

Адміністрацыя яшчэ ў даўгу

(Фабрыка абутку, Менск)

У кастрычніку мінулага году вытворчая камісія менскай фабрыкі абутку ўвяла картачную сыстэму праверкі выкананьня прапаноў рабочых. Гэтае мерапрыемства было выклікана тым, што адміністрацыя фабрыкі не заўсёды выконвала прапановы вытворчых камісій і нарад. Падліку гэтых прапаноў, а таксама ступені выкананьня іх ня было. Увядзеньне картачнай сыстэмы зрабіла пералом: адміністрацыя стала больш сур'ёзна адносіцца да прапаноў рабочых і праводзіць іх у жыцьцё. За час з кастрычніка месяца вытворчыя нарады ўнесьлі 12 розных прапаноў рацыяналізатарскага характару. Амаль усе гэтыя прапановы ўжо выкананы, а некаторыя знаходзяцца ў стадыі ажыцьцяўленьня.

Аднак, адміністрацыя фабрыкі яшчэ ў даўгу. Яшчэ каля пяці месяцаў таму назад вытворчая камісія прапанавала перадаць закройкі язычкоў рабочым больш нізкай кваліфікацыі. Гэту работу ўвесь час выконваюць закройшчыкі ў той час, як гэта могуць рабіць рабочыя, менш кваліфікаваныя. Аднак, да гэтага часу адміністрацыя не ажыцьцёвіла прапанову вытворчай камісіі. Язычкі ўсё яшчэ выкройваюцца закройшчыкамі.

Не праведзена ў жыцьцё таксама прапанова аб тым, каб зрабіць штампы для лубкоў да бацінак для хлопчыкаў. Ажыцьцяўленьне гэтае прапановы дало-б фабрыцы значную эканомію. Адміністрацыя фабрыкі павінна яшчэ больш акуратна выконваць прапановы рабочых і не заставацца ў даўгу.

С.

Зводкі з фабрык і заводаў

Забясьпечыць завод матар'яламі

Гомель. Гомельскі машынабудаўнічы завод „Пралетары" **за першую дэкаду лютага** перавыканаў свой прамфінплян **на 10 проц.** Асобныя цэхі заводу выканалі свае праграмы з яшчэ большым перавышэньнем. Кацельны цэх выканаў заданьне на 134 проц., арматурны—на 118 проц., медналіцейны—на 115 проц. Недавыканаў свае праграмы **мэханічны цэх.** Паводле пляну, ён павінен быў выпусьціць за 10 дзён лютага прадукцыі на 38 тысяч руб., выпусьціў-жа толькі на 32 тыс. руб.. г. зн. выканаў **85,5 проц.** заданьня. Чыгуна-ліцейны цэх выканаў заданьне на **106,5** проц.

За апошні час наглядаецца нястача кацельнага жалеза, карбіду і інш. асноўных матар'ялаў. Арганізацыі, якія забясьпечваюць завод гэтымі матар'яламі, **не прынялі мер для поўнага забесьпячэньня заводу патрэбнымі матар'яламі.** Гэта становішча стварае пагрозу недавыкананьня праграмы за люты.

С. Г.

ЛЕПШАЯ РАБОТНІЦА

Завод «Чырвоная Зара». Упаковачнае аддзяленьне. Работніца **Чэрчэс Р.**, 19 год, на вытворчасьці працуе 4 гады. Норма выпрацоўкі—64.000 пачак у месяц, тав. Чэрчэс вырабляе 73.500 пачак, г. зн. на 12,9 проц. больш нормы.

ЛЕПШЫ РАБОТНІК

Завод «Энэргія». Сялесарна-зборачны цэх. Сялесар **Мільскі М. Г.**, 37 год, працоўны стаж—19 год. Норма—збор 20 гравіясартыровак у месяц, тав. Мільскі зьбірае 30 шт. Тав. Мільскі—старэйшы брыгадзір.

Ліквідаваць прарыў у наборным цэху

З прычыны кепска наладжанага вучоту выкананьня прамфінпляну ў І-й ДРУКАРНІ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА толькі зараз высьветлілася, што наборны цэх ЗА СТУДЗЕНЬ ня выканаў вытворчае праграмы НА 6,8 ПРОЦ.; пры агульным ПЕРАВЫКАНАНЬНІ ПРАГРАМЫ НА 11 ПРОЦ.

АДМІНІСТРАЦЫЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ НАЛАДЗІЛА СТАЛАГА ІНФАРМАВАНЬНЯ РАБОЧЫХ АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ, ЗВОДКІ НЯ ВЫВЕШВАЮЦЦА, РАБОЧЫЯ НАБОРНАГА ЦЭХУ НЯ ВЕДАЮЦЬ КОЛЬКІ ІМ ПА НОРМЕ ТРЭБА Ў ДЗЕНЬ ДАВАЦЬ НАБОРУ.

Фабзаўком склікае гэтымі днямі НАРАДУ ЎДАРНІКАЎ УСІХ ЦЭХАЎ для абгаварэньня шляхоў ліквідацыі прарыву ў наборным цэху.

Б.

Месячнік лесазагатовак

ДА КАНЦА МЕСЯЧНІКА ЗАСТАЎСЯ ТОЛЬКІ ТЫДЗЕНЬ

ПЕРАЛОМУ Ў ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ ЯШЧЭ НЯМА

Да адказнасьці тых, хто сваёй нядбайнасьцю зрывае выкананьне заданьня аб вывазцы лесаматар'ялаў

Дэкаднае заданьне сарвана

Выве зена толькі 42,7 проц. пляну

МАЗЫР (наш кар.). Першая дэкада месячніка не дала належнага пералому. Заданьне аб узмацненьні вывазкі лесу ня выканана.

Вывезена толькі 42,7 проц. дэкаднага заданьня па лесаматар'ялах і 59,2 проц. па дровах.

На першым месцы па вывазцы лесаматар'ялаў ідзе **Калінкавіцкі раён.**

У Тураўскім раёне вельмі слаба працуюць вярбоўшчыкі, лесазагатоўкі дрэнна забясьпечаны хлеба-фуражом.

Замоскае спажывецкае таварыства, Пятрыкоўскага раёну, ня мае аўсу і не клапоціцца аб тым, каб дастаць яго.

Грабаўскі і Камаравіцкі сельсаветы зусім адмовіліся дапамагаць лесазагатоўкам.

Амаль не дапамагаюць кампаніі калгасы Мазыршчыны. Калінкавіцкі калгас, які мае 110 фурманак, даў толькі 5. Калгасы в. Смалянка, Калінкавіцкага раёну і Зелянецкага сельсавету, Азарыцкага раёну, зусім адмовіліся даць людзей і фурманкі для вывазкі.

Амаль не зварачаецца ўвага на прыцягненьне кулакоў да гужавое павінасьці.

М. В.

45 тысяч—на прэміі ўдарнікам лесазагатовак

Для заахвочаньня сацспаборніцтва паміж камсамольскімі брыгадамі, лесарубамі, арцелямі калгасьнікаў і супрацоўнікамі лесазагатоўчых вучасткаў, Лесбел вызначыў фонд прэміяваньня ў суме 45.000 рублёў. Гэтыя грошы будуць выданы тым, хто пакажа лепшыя вынікі ў выкананьні плянавых заданьняў па загатоўцы і вывазцы лесу.

Трэст арганізаваў спэцыяльную камісію для разьмеркаваньня фонду прэміяваньня.

Прымусіць кулакоў выканаць гужавую павінасьць

— Што зроблена, каб прымусіць кулакоў выканаць гужавую павінасьць?

У адказ на гэтае пытаньне ў НКЮ паведамілі нашаму супрацоўніку наступнае:

— Зараз узмоцнена карная санкцыя артыкулу 95 КК (аб адмаўленьні ад павіннасьці) — да 5 год пазбаўленьня волі з канфіскацыяй цягавай сілы. Узмоцнена пакараньне і па артыкуле 103 КК (аб агітацыі і прапагандзе супроць павіннасьцяй).

Наркамюст паслаў усім акрсудом і акрпракурорам абежнік, які прапануе прыцягваць да адказнасьці.

ТРЫВОЖНЫЯ ВЕСТКІ З ПОЛАЧЧЫНЫ

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). На лесазагатоўчых вучастках не хапае гужавое сілы.

Ва ўсім лесазагатоўчым раёне працуе толькі 2.770 фурманак, ці 15 проц. кантрольных лічбаў. Сосьненскі сельсавет, Полацкага раёну, ня даў ніводнае фурманкі.

Кулакі амаль ва ўсіх сельсаветах ня прыцягнуты да гужавое павінасьці.

Вельмі слаба дапамагаюць лесазагатоўкам калгасы і саўгасы.

Прыцягнута толькі 350 кулацкіх коняй

БАБРУЙСК (наш кар.). Недапушчальна павольна ідзе вывазка лесу з вучасткаў Бабруйскага аддзяленьня Лесбелу.

На 15-га лютага вывезена будаўнічай драўніны каля 17 проц. заданьня і дроў—каля 15 проц. заданьня.

Павольны тэмпы вывазкі тлумачацца значным недахватам рабочае сілы. У той час, калі ў другім квартале павінна было працаваць 9.000 лесарубаў, працуе толькі каля 6.000; замест патрэбных 11.000 фурманак, ёсьць толькі —7.000.

Зусім недапушчальныя адносіны сельсаветаў і райвыканкомаў да прыцягненьня кулацтва да гужавое павінасьці. Па акрузе прыцягнута толькі каля 350 кулацкіх коняй. Дырэктывы акрвыканкому ня выконваюцца.

Не хапае шынпага жалеза; каапэрацыйны саюз корміць толькі заяўкамі і абяцаньнямі, але гэтым саней не падкуеш. Няма таксама падкоўнага жалеза.

Лесбел даў заяўкі акруговаму спажывецкаму саюзу па патрэбную колькасьць прадуктаў, але прадукты не адпушчаны.

Ніхто ня сочыць за тым, як праводзіцца сацспаборніцтва на вучастках.

Да канца месячніка застолся 8 дзён. Трэба гэты пэрыяд скарыстаць для рашучага ўзмацненьня вывазкі лесу, каб да 25-га лютага поўнасьцю выканаць заданьне.

В. Ц.

Пералом на галянтарэйнай

Фабрыка «БЕЛАРУСКА» (Менск) у студзені выканала вытворчую праграму ўсяго на 61,5 проц. У лютым наглядаецца вялікі пералом; ЗА ПЕРШЫЯ 10 ДЗЁН ВЫТВОРЧАЯ ПРАГРАМА ВЫКАНАНА НА 97 ПРОЦ.

Але разам з тым, ёсьць рад недахопаў, якія перашкаджаюць выкананьню і перавыкананьню пляна. У аддзяленьні вырабу гузікаў наглядаюцца выпадкі ПРАСТОЮ МАШЫН З ПРЫЧЫНЫ НЯДБАЙНАСЬЦІ ЦЭХАВАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ. Каб паправіць пас на машыне, прыходзіцца па некалькі гадзін шукаць матар'ял. Таксама траціш шмат часу, калі трэба зьмяніць разцы на машыне, бо гатовых разцоў ніколі няма. У гэтым-жа аддзяленьні стаяць машыны, якія ЗУСІМ НЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ў той час, як іх можна было-б прыстасаваць да вырабу галалітавых гузікаў і павялічыць штодзённы выраб гузікаў ня менш, як на 150 гросаў.

Ударнікі павінны дапамагчы адміністрацыі неадкладна зьнішчыць недахопы.

А.

Часьці БВА з гонарам вытрымалі экзамэн

Створаны сотні новых калгасаў.—Абагулены і ачышчаны тысячы тон насеньня.—Адрамантаваны сотні машын

Будзем і надалей умацоўваць сувязь калгасаў з Чырвонай арміяй

ВЫНІКІ АГРАПАХОДУ

Скончыўся аграпаход войск БВА.

Дасканала праведзена мабілізацыя чырвонаармейскай грамадзкасьці вакол пытаньняў веснавое пасеўнае кампаніі, калектывізацыі, вакол новага лёзунгу партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Дзесяткі тысяч людзей былі кінуты на вёску ў дапамогу аграмаджанаму сэктару.

Гарнізон за гарнізонам, калёна за калёнай рушыліся часьці ў аграпаход.

Дзьве задачы ставіліся перад аграпаходам—гэта аказаць практычную дапамогу аграмаджанаму сэктару вёскі для падрыхтоўкі да веснавое сяўбы і праверку вайсковых ведаў часьцей і ўменьне імі вырашаць тактычныя задачы.

Паходны рух ва ўмовах пагрозы паветранага нападу, марш у зімовых умовах, служба разьведкі—вось тактычныя задачы, якія прапрацоўвалі часьці па шляху ў свае раёны і пасьля прапрацоўкі гэтых задач—рассыпаліся па вёсках, саўгасах і камунах.

Батрацка-бядняцка-серадняцкія масы з сапраўдным энтузіязмам сустракалі часьці і згуртаваліся ў рабоце з чырвонаармейскімі брыгадамі.

Калі быў абвешчаны аграпаход, кулаччо пачало пашыраць недарэчныя чуткі, што партыя скасавала лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі, прабавала запалохаць беднату.

У вёскі, дзе моцны яшчэ кулацкі ўплыў, дзе слабая работа па калектывізацыі, былі кінуты агітатары, аграномы, зоатэхнікі.

Кулацкай агітацыі быў дан адпор. Злосную шыпеньню процінастаўлена была выразная і ясная лінія партыі.

Вось некаторая доля тэй вялікай праробленай работы.

Часьці №-скай дывізіі ўцягнулі ў калгасы больш за 2.000 гаспадарак. Беларуская арганізавала і аформіла 11 калгасаў, абагуліла 170 тон насеньня, ачысьціла 130 тон насеньня, правяла 78 сходаў. 33-я дывізія дала 6.228 гаспадарак калгасу, абагуліла 1.148 тон і ачысьціла 610 тон насеньня.

Вынікі вялікія.

Тысячы і тысячы гаспадарак уцягнута ў калгасы. Створаны сотні новых буйных калгасаў. Дзесяткі калгасаў ператвораны ў гіганты. Абагулена і ачышчана дзесяткі тысяч пудоў насеньня.

Адрамантаваны сотні с.-г. машын і прылад, пераабсталяваны сотні і сотні хлявоў у абагуленыя хлявы.

Абагульвалі жывёлу, корм, будавалі кармушкі, рамантавалі школы, сельсаветы, вучылі калгасьнікаў рахункаводзтву, рабілі прышчэпкі, лячылі жывёлу, чыталі агра-і зоа-лекцыі, раздавалі літаратуру, друкавалі сотні газэт і тысячы лістовак.

Лёзунг—што баец Чырвонай арміі ёсьць перадавы змагар і арганізатар на фронце калектывізацыі—атрымаў поўнае пацьвярджэньне на справе.

Самі байцы атрымалі практычнае загартаваньне, яны паказалі вёсцы прыклад баявой і клясавай вывучкі, узор высокай актыўнасьці.

«Аграпаход часьцей БВА, які даў вялікі штуршок у справе падрыхтоўкі да веснавое сяўбы, прароблены нашымі часьцямі з энтузіязмам і посьпехам»,—піша ў адным са сваіх артыкулаў Нач. ПУАКРА **тав. Аранштам.**

Задача нашых мясцовых арганізацый, той вялікі ўздым, які створаны аграпаходам, пераключыць па далейшае разгортваньне калгаснага руху, на пераход цэлых сельсаветаў і раёнаў у раёны суцэльнай калектывізацыі, і на базе гэтага праводзіць ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Вялізны прыклад сацыялістычнай актыўнасьці стварыў і ў часьцях нябывалы ўздым, які партыйныя і палітычныя органы часьцей накіроўваюць у рэчышча палянізаваньня і ўзьняцьця баявой падрыхтоўкі. Зараз у акрузе пачалася масавая самаправерка баявога сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, і гэтым павінны замацавацца за часьцямі тая актыўнасьць і ўзрослая палітычная сьвядомасьць, створаныя аграпаходам. Нашым часьцям у парадку шэфства ў далейшым трэба будзе замацаваць гэтыя вялікія дасягненьні аграпаходу.

Аграпаход скончыўся.

Важны палітычны экзамэн часьці БВА вытрымалі з гонарам.

М. В.

Батрацка-бядняцкія масы дзякуюць Чырвоную армію за працу ў аграпаходзе

Калгас імя «Дзевятага Студзеня» в. Макаўчыц шчыра дзякуе АБЕШ за дапамогу ў перабудове сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад. Ваша школа за кароткі тэрмін работы паказала, што яна, як і ўся Чырвоная армія, вельмі зацікаўлена ў выкананьні дырэктыў камуністычнай партыі і савецкай улады па калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Мы ўлэўнены ў тым, што супольная работа дасьць магчымасьць хутчэй пабудаваць сацыялізм у нашай краіне.

Прэзыдыум сходу калгасьнікаў в. Макаўчыцы.

***

Мы, арцель імя Войкава і акружаючыя пасёлкі, перадаем сардэчную падзяку чырвонаармейцам 192 палка і ваенкому тав. Суславу за іх актыўную работу і дапамогу ў справе калектывізацыі нашых пасёлкаў.

Чырвонаармейцы, ня гледзячы на халоднае надвор'е, працавалі па пабудове хлявоў для абагуленьня скаціны. Сваёй актыўнасьцю ў рабоце яны надалі бадзёрасьці нашым сялянам, і мы з іх дапамогай за тры дні абагулілі ўсіх кароў, коняй, сабралі насенны фонд.

Мы добра бачым, што Чырвоная армія ідзе побач з намі ў нашай рабоце па калектывізацыі.

Ад імя калгасьнікаў імя Войкава старшыня калгасы ШЫДЛОЎСКІ.

Чым выкліканы перабоі ў працы Бабруйскага камбінату

Лесбел дрэнна кіраваў камбінатам

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Скончыла сваю работу камісія ЦКК-НК РСІ, якая абсьледавала становішча на бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. Камісія канстатавала, што ў асноўным **будаўніцтва камбінату выканана з тэхнічнага боку здавальняюча**, камбінат зьяўляецца вялізарнейшым дасягненьнем нашага будаўніцтва ў БССР і добрым прыкладам прамысловага будаўніцтва для ўсяго Саюзу.

Але побач з гэтым у камбінаце ёсьць галоўнай недахопаў, якія вынікаюць, галоўным чынам, з таго, што **адпаведныя гаспадарчыя органы, асабліва трэст Лесбелу, не зварачалі належнае ўвагі на пастаноўку работы камбінату.**

Невыстарчальна былі ацэнены магчымасьці і размах работы камбінату. Напрыклад, пабудавана сартоўка лесапільнага цэху, але прапускная здольнасьць яе незадавальняючая. Яна не адпавядае цяперашнім тэмпам працы.

У падвале фанэрнага цэху быў устаноўлены кандэнсацыйны бак для зьбіраньня пары, але велічыня яго невыстарчальная. Пастаўленая для выпампоўваньня вады з баку помпа не адпавядае магутнасьці напору вады і не пасьпявае адліваць яе. Гэта і зьявілася прычынаю аварыі баку, якая выклікала спыненьне работы фанэрнага цэху на два дні. Незадавальняюча пабудаваны бедаладроўны цэх.

Нельга таксама пахваліцца і абсталяваньнем камбінату. Тут Лесбел выявіў вялікую нядбайнасьць.

Лушчыльныя варштаты не даюць належнае прадукцыйнасьці працы. Аўтаматычныя ножны з прычыны дрэннай іх канструкцыі давалі ў пачатку перабоі ў рабоце. Два вальцы да алціскання сіроп не апраўдалі і стаяць бяз ужытку. Нездатныя і 7 вагонэтак для знутры-заводзкага транспарту. Выпісаны сушыльныя апараты розных канструкцый, але яны ня працуе дрэнна і патрабуе паліва з іх працуе дрэнна і патрабуе паліва больш высокага ціску. Каштоўнае абсталяваньне для нажавой фанэры (экспарту), пастаўленае яшчэ ў лістападзе месяцы, дагэтуль ня пушчана ў работу, з прычыны позьняга мантажу сушыльні і адсутнасьці інструктара. Для гэтага абсталяваньня запасныя часьці ня былі заказаны.

Усё гэта пагражае нармальнай рабоце тых або іншых машын.

На камбінаце ёсьць цэх па вырабе сьпінак і сядзэньняў для крэспаў, але ён не працуе. Чаму? Высьвятляецца, што **пабудова гэтага цэху на камбінаце была нямэтазгоднай і памылковай**, бо ў раёне няма патрэбнае для гэтага сыравіны. Закупленае і пастаўленае абсталяваньне для цэху, мабыць, прыдзецца перадаць віцебскаму заводу, дзе выраб часьцей да крэслаў забясьпечаны патрэбнай сыравінаю.

Вытворчасьць фанэры перавышае ужо меркаваньні Лесбелу на 30 проц. Уже зараз паўстае пытаньне аб патрэбе тэхнічнага пашырэньня гэтага віду вытворчасьці камбінату.

Мала што было зроблена для падрыхтоўкі рабочае сілы для фанэрнага цэху. Кваліфікаваная рабочая сіла з іншых прадпрыемстваў на камбінат ня была перакінута. Фанэрны цэх прымушаны быў набіраць рабочых праз біржу працы і вучыць іх у працэсе працы, што дрэнна адбіваецца на прадукцыйнасьці працы і якасьці прадукцыі.

Усе гэтыя акалічнасьці кожны дзень ставяць пад пагрозу нармальную работу камбінату.

У далейшым трэба забясьпечыць усе цэхі камбінату адпаведнай сыравінай, забясьпечыць камбінат тэхнічным пэрсаналам, кваліфікаваным і, нават, некваліфікаваным рабочай сілай. Толькі пры гэтых умовах работа Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату будзе ісьці бесперабойна.

А. МАГІДАЎ.

Па Савецкай Беларусі

Склады фасфарытнага млыну завалены мукой, а ў калгасах не хапае ўгнаеньня

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш кар.). З Каробчынскага фасфарытнага млына паведамляюць, што склады млына завалены фасфарытнай мукой.

Між тым, райкалгассаюзы нічога ня робяць, каб атрымаць вызначаную ім колькасьць фасфарытнае мукі.

Калгасы Горацкага раёну павінны былі атрымаць 6 вагонаў, атрымалі 1 вагон, Дрыбінскі раён павінен быў атрымаць 4 вагоны, атрымаў 1, Расьнянскі —замест 6 атрымаў 2, Мсьціслаўскі раён замест 7—атрымаў 2,5.

Ёсьць пагроза, што калгасы з прычыны нядбайнасьці мясцовых арганізацый застануцца бяз хэмічнага ўгнаеньня.

Загадчык млынам зьвярнуўся да Аршанскае акрпракуратуры з просьбаю прыцягнуць да адказнасьці калгассаюзы вышэйназваных раёнаў, бо яны зрываюць падрыхтоўку да пасеўнае кампаніі.

Перавыбары саветаў па Бабруйскай акрузе

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Прэзыдыум Бабруйскага АВК пастанавіў правесьці з 15-га лютага па 15-га сакавіка справаздачна-праверачную кампанію сельсветаў, местачковых і гарадзкіх саветаў. Апрача таго, пастаноўлена зрабіць перавыбары ўсіх сельсаветаў Рагачоўскага, Жлобінскага, Слуцкага і Чырвона-Слабодзкага раёнаў (раёны суцэльнай калектывізацыі).

Будуць таксама перавыбраны сельсаветы і пасёлковыя дэпутаты, якія пляліся ў хвасьце калектывізацыі і ў далейшым ня здольны праводзіць цьвёрдага кіраўніцтва калгасным рухам і ліквідацыяй кулацтва, як клясы. АВК даў дырэктыву, каб у новых сельсаветах было выбрана ня менш 25 проц. жанчын.

Усім гарсаветам прапанавана выдзеліць брыгады найбольш актыўных дэпутатаў для дапамогі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Падрыхтоўка да ўсебеларускай выстаўкі праводзіцца вельмі дрэнна

МАЗЫР. (Наш кар.). Падрыхтоўка да Ўсебеларускае выстаўкі на мясцох праходзіць вельмі слаба. Юравіцкі, Калінкавіцкі і Пятрыкоўскі раёны дагэтуль ня склалі плянаў падрыхтоўкі; тыя раёны, якія ўжо маюць пляны, пакажылі іх у папкі, або прышлі да справы.

Ня гледзячы на рад напамінаў, дагэтуль ня прыслалі экспанатаў збожжавых культур з выстаўкі мінулага году.

Насельніцтва ўсім ня ведае аб выстаўцы, бо апошняя не папулярызуецца.

Падпал калгасу

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 15-га лютага, а 4-й гада, раніцы, ад падпалу ўзьнік пажар у калгасе «Новы Быт» (Нісяцкі сельсавет, Клічаўскага раёну). Згарэў дом і пудоў 500 бульбы і насеньня нікі.

На месца пажару выехала камісія.

Суд над агітатарамі за распродаж жывёлы

МАЗЫР. (Наш кар.). У Капаткевіцкім рэйне за апошні час праведзена 8 судовых працэсаў супроць кулакоў і падкулачнікаў, якія вялі агітацыю за распродаж жывёлы і маемасьці і за зьнішчэньне насеньня.

Абвінавачаныя прысуджаны па розных тэрміны зьняволеньня з высылкай за межы БССР пасьля адбыцьця пакараньня і канфіскацыяй маемасьці.

Зьнізіўся тэмп ільна-загатовак

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). За апошні час па Гомельшчыне тэмп ільна-загатовак зьнізіўся. У студзені месяцы заданьне выканана толькі на 53 проц. Некалькі павялічыўся тэмп загатоўкі канапляннага насеньня. Гадавы плян выкананы ўсяго на 31 проц.

Усебеларускі зьлёт „лёгкае кавалерыі“

Узьняць клясавую баяздольнасьць груп „Лёгкае кавалерыі“!

Пазаўчора і ўчора працягваліся спрэчкі па дакладу сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Палякова. Усе выступаўшыя ў сваіх прамовах падавалі прыклады добрай і дрэннай пастаноўкі работы атрадаў «лёгкай кавалерыі».

Тав. Зарэцар (Менск, шчотачная фабрыка) адзначыў дрэннае кіраўніцтва РК ЛКСМ і РСІ працаю «лёгкай кавалерыі». Калі, напрыклад, атраду «Л. К.» быў патрэбен дакладчык па пытаньні аб ролі «Л. К.» у нашым будаўніцтве, дык ні РК, ні РСІ дакладчыка не далі.

Тав. Фінкэльбэрг (стары рабочы лесазаводу імя Томскага, Рачыца) заявіў, што ён, ня гледзячы на свой узрост, апаходзіцца ў атрадзе «Л. К.», бо лічыць ле работу вельмі важнай і патрэбнай.

Наогул, усе выступаўшыя падкрэсьлівалі ў сваіх прамовах, што органы РСІ на масіох дрэнна кіруюць працай «Л. К.», мала цікавяцца вынікамі налётаў і ня робяць належных вывадаў па выкрытых лёгкімі кавалерыстымі фактах.

Тав. Гершон расказаў зьлёту аб абураючым факце заціску самакрытыкі на адным з гомельскіх заводаў, дзе быў зьняты з работы начальнік атраду «Л. К.» тав. Плоткін за тое, што ён выкрыў гнойнік на заводзе.

Было адзначана шмат характэрных фактаў з працы «Л. К.» на вёсцы. Дэлегат з Магілёўскае акругі тав. Фон-Кац расказаў аб тым, як «Л. К.» рабіла налёт на адзін з калгасаў Магілёўшчыны. Выявілася, што машыны па ачыстцы збожжа стаялі ў гэтым калгасе без работы ў той час, калі ў іншых калгасах распачынаць ачыстку збожжа нельга было з прычыны адсутнасьці машын.

Увогуле работа атрадаў «Л. К.» на вёсцы пастаўлена покуль што яшчэ неадвальняюча.

У спрэчках па дакладу тав. Палякова выступіў таксама прадстаўнік ЦК УсеЛКСМ тав. Сайкін, які паказаў на хібы ў дзейнасьці асобных атрадаў «Л. К.». Некаторыя «Л. К.» замест таго, каб паправіць работу апарату, пачынаюць дыктаваць яму свае ўмовы. Тав. Сайкін расказаў, як на адным з фабрык Іванава - Вазьнясенску, а прычыны дзейнасьці шкоднікаў развалілася ўдарная брыгада. У той час група «Л. К.» замест таго, каб практычна весьці барацьбу са шкоднікамі, займалася толькі агітацыйнай работай. Такая група «Л. К.», якая не вядзе барацьбы са шкоднікамі, ня сочыць за выкананьнем прамфінпляну, за правільным выкананьнем лініі партыі, — не апраўдвае свайго прызначэньня — яе трэба раскасіраваць.

* * *

Пад гучныя воплескі ўсяе залі з прывітаньнем ад ЦК КП(б)Б выступіў тав. Васілевіч, які спыніўся на важнейшых задачах сучаснага пэрыяду і ахарактарызаваў ролю «лёгкай кавалерыі» ў выкананьні генэральнае лініі партыі.

— **Задача разьбіць рэшткі капіталізму патрабуе ад кожнага «кавалерыстага» ўменьня арыентавацца ва ўсёй суме тых баявых задач, якія паставіла перад намі партыя.**

— «Лёгкія кавалерыстыя» павінны дапамагчы партыі і камсамолу ажыцьцяніць генэральную лінію, наладзіць масавы рабочы кантроль за сав.апаратам, каб ён змог, як належыць, абслугоўваць працуючае насельніцтва, каб ён адпавядаў тым вялізным задачам, якія зараз на яго ўскладаюцца.

— **Узьняць клясавую баяздольнасьць груп «лёгкае кавалерыі» — адна з асноўных задач зьлёту.**

Ад імя ЦКК-РСІ зьлёт вітаў т. Калнін, які спыніўся на задачах «лёгкае кавалерыі» ў барацьбе з бюракратызмам у дапамозе РСІ ў рабоце на паляшпэньні савецкага апарату.

* * *

У часе пасяджэньня ў залю ўвайшлі камсамольцы Кастрычніцкага раёну, ад імя якіх выступіў з прывітаньнем рабочы гуты «Пралетары» тав. Герчыкаў, які заявіў, што ў асобе ўсебеларускага зьлёту «Л. К.» камсамольцы вітаюць актывістых - барацьбітоў за выкананьне прамфінпляну, за павялічэньне прадукцыйнасьці працы, і за соцыялістычную вёску. Ад імя піянэраў Вульскага раёну (Полачыцка) вітаў зьезд т. Гарбуз, які расказаў, як група «юных кавалерыстых» выявіла кулакоў, што пралезьлі ў калгасы.

* * *

Удзельнікі зьлёту сабралі каля 200 рублёў у фонд пабудовы падводнай лодкі імя газэты «Чырвоная Зьмена».

З ліку ўдзельнікаў зьлёту вылучана 7 чал. у рэдкалегію насьцэнгазэты зьлёту і 19 брыгад для праверкі ўдзелу менскіх клюбаў у трохмесячніку беларускай культуры.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальную тэлеграму ЦКК УсеКП(б). **Ц. М.**

Збор каштоўнасьцяй—у фонд індустрыялізацыі

Паступленьне каштоўнасьцяй у фонд індустрыялізацыі ад жонак рабочых і служачых, якія пражываюць у жактах, набывае шырокія разьмеры. Кожная хатняя гаспадыня лічыць сваім абавязкам аддаць якую-небудзь каштоўную рэч у фонд індустрыялізацыі краіны.

На канфэрэнцыі жонак рабочых і служачых, якія пражываюць у жактаўскіх дамох (што нядаўна адбылася ў клюбе АВК), стол прэзыдыум быў завалены залатымі і срэбнымі рэчамі. Гэтыя каштоўнасьці дадаткова даставілі жакты №№ 6, 18 і 22.

Прадстаўнікі жонак рабочых і служачых у сваіх выступленьнях адзначылі, што яны ня хочуць стаяць у баку ад сацыялістычнага будаўніцтва і хочуць матар'яльна дапамагчы дзяржаве.

Дзеці жакту № 4 сабралі 8 р. 50 к., якія таксама аддалі ў фонд індустрыялізацыі краіны.

Н. Д.

Як некаторыя гаспадарнікі „дапамагаюць“ мабілізацыі рахункаводаў

Злыя і пахмурныя зьявіліся гаспадарнікі г. Бабруйску ў праўленьне саюзу саўгандальслужачых, каб адваяваць сваіх бухгальтароў і рахункаводаў, якіх акруговае праўленьне саюзу пастанавіла мабілізаваць на работу ў калгасы.

— Браткі, — пачаў сваю прамову старшыня Бабруйскага саюзхлеба, тав. Гольдбэрг, — я за калгасы, але... свайго бухгальтара адпусьціць ніяк не магу. Чаму-ж вы ў мяне не запыталі, калі думалі пасылаць майго бухгальтара ў калгас?

— Не! Не на такога дурня напалі, каб згадзіўся на пасылку свайго спэцыяліста на работу ў калгас, — заўляў Гольдбэрг, — я ведаю, што саюз хацеў трапіць на чырвоную дошку, ьось і правёў вярбоўку бухгальтароў у калгасы з перавышэньнем.

Ня лепш вёў сябе і старшыня ЦРК тав. Кантар.

— Як вы адважыліся без майго дазволу паслаць у калгасы цэрабкопаўскіх бухгальтароў!

Тав. Кантар быў моцна нездаволены, што бухгальтар ЦРК наведваў курсы для калгасьнікаў.

Скардзіліся і прадстаўнікі сельбанку, што акруговае праўленьне саюзу бяз іх ведама займалася вярбоўкаю рахункаводаў для работы ў калгасах.

Спрэчкі паміж бабруйскімі гаспадарнікамі і саюзам вырашыў цэрабкопаўскі рахункавод. Ён заявіў, што тут гутарка ідзе аб рахункаводах-добраахвотніках, якія былі першымі пачынальнікамі гэтае справы і далі сваю згоду ехаць на работу ў калгасы. Гаспадарчыя ўстановы ня могуць прымусам затрымліваць іх на рабоце. Гаспадарнікі павінны пайсьці насустрач жаданьню дапамагчы калгаснаму будаўніцтву.

Выступленьне рахункавода паклала канец спрэчкам.

Л. МАНІН.

300 спэцыялістых с.-г.— на работу ў калгасы

Па БССР мабілізавана і паслана ў раёны для правядзеньня падрыхтоўкі да веснавое пасеўнае кампаніі каля 300 аграномаў, каморнікаў і лясных работнікаў. Мабілізаваныя прабудуць на вёсцы 2 месяцы. Бабруйская сэкцыя с.-г. спэцыялістых вылучыла спэцыяльную брыгаду з 5 чалавек.

У радзе акруг каморнікі пастанавілі адмовіцца ад чарговага летняга воднуску, каб скончыць работу па зямляўпарадкаваньні калгасаў.

Бабруйскія і гомельскія каморнікі ўступілі ў сацспаборніцтва на лепшую работу.

Гастролі Маскоўскага лялечнага тэатру

З 1-га сакавіка ў Менску пачынаюцца гастролі 2-га ансамблю маскоўскага вандроўнага лялечнага тэатру. Трупа вязе з сабою дэкарацыі, гарнітуры і электрычнае абсталяваньне. Пастаноўкай кіруе мастак Барысаў. Спэктаклі трупы праходзяць з музычнай ілюстрацыяй.

Ансамбль дасьць некалькі спэктакляў для дзяцей у клюбах саўгандальслужачых, мэталістых, працасьветы, гарбароў і г. д.

Гастролі тэатру павінны выклікаць за цікаўленасьць пэдагогаў, бо пастаноўкі лялечнага тэатру дадуць кіруючыя паказаньні, як трэба будаваць дзіцячую сцэну.

За запатрабаваньнямі на арганізацыю дзіцячых спэктакляў трэба зварачацца ў «Пасрэдрабіс».

МЕНСК

Новы нарком аховы здароўя

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў аслабаніць т. М. І. БАРСУКОВА ад абавязкаў народнага камісара аховы здароўя БССР.

Народным камісарам аховы здароўя назначаны т. ЦЭНЦЫПЭР Я. С. (загадчык АПА Менскага акругкому КП(б)Б).

Усебеларускі зьезд КСУ

22-га лютага ў Доме Селяніна адкрываецца VI усебеларускі зьезд сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі. У рабоце зьезду прымуць удзел 220 дэлегатаў ад усіх раёнаў БССР. Зьезд заслухае даклад т. Галадзеда аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і задачах КСУ і даклад ЦК КСУ аб яго рабоце.

Выклік т. Шыманскага

Інспэктар Менскага акруговага аддзелу асьветы М. Шыманскі ўнёс у фонд індустрыялізацыі краіны аблігацыі 2-е пазыкі індустрыялізацыі на суму 125 руб. і выклікаў усіх інспэктароў НКА, усіх інспэктароў і супрацоўнікаў Менскага акруговага інспэктарыяту асьветы.

ЗА ДЗЕНЬ

Прыгарадны садова-малочны камбінат. Прыгарадныя саўгасы Курасоўшчыны, Лошыца і Сеньніца аб'ядноўваюцца ў адзін буйны садова-гародні і малочны камбінат. Перад Менскім акрыканкомам пастаўлена пытаньне аб аб'яднаньні іншых прыгарадных саўгасаў Меншчыны.

Усебеларуская нарада старшынь КСУ. У канцы лютага ЦК КСУ склікае ўсебеларускую нараду старшынь камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі. Нарада прапануе пытаньне аб удзеле КСУ ў правядзеньні пасеўнае кампаніі.

Таварыства «Тэхніка—масам». Беларускае Міжсаюзнае Бюро ІТС вылучыла спэцыяльную камісію для распрацоўкі пытаньня аб арганізацыі ў Беларусі таварыства «Тэхніка—масам».

Курсы мэліярацыйных працаўнікоў. 1-га сакавіка ў Мазыры адкрываюцца ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы мэліярацыйных работнікаў — нівэліроўшчыкаў і пікетажыстых на 150 чал. Курсы будуць укамплектаваны с.-г. рабочымі і батракамі.

Ад'езд т. Галадзеда. Старшыня СНК БССР т. Галадзед выехаў у акругі для правядзеньня падрыхтоўкі да веснавое пасеўнае кампаніі.

Зпідамія сыпнога тыфусу ў 2-х раёнах Меншчыны

За апошні час у Лагойскім і Астрашыцка-Гарадзецкім раёнах (Меншчына) зарэгістраваны рад выпадкаў захворваньняў на сыпны тыфус. У гэтым раёны выехаў прадстаўнік акруговага інспэктарыяту аховы здароўя доктар Фрэйдзін, які зрабіў дэзынфэкцыю, а таксама шпіталізаваў усіх хворых на тыфус.

САУГАСНА-КАЛГАСНЫ КАМБІНАТ НА МАР'ІНЕ

Зусім рэальным і падлягаючым ажыцьцяўленьню ў бліжэйшы час зьяўляецца праект арганізацыі саўгасна-калгаснага камбінату на Мар'інскім капёнзацыйным фондзе. На асушаных вялізных балотах гэтага фонду даволі шпарка разьвіваецца саўгас імя 10-цігодзьдзя БССР (на плошчы каля 10.000 гэкт.) і група калгасаў імя Беларускае Вайсковае Акругі з наўкольнымі сялянскімі калгасамі (таксама на мэліяраваных балотах) на плошчы ў некалькі дзесяткаў тысяч гэктараў.

Як саўгас, так і калгасы на Мар'інскім фондзе адчуваюць патрэбу ў радзе буйных прадпрыемстваў па апрацоўцы і пераапрацоўцы сырцу. У зьвязку з гэтым вызначана прыступіць яшчэ ў гэтым годзе да пабудовы саўгасна-калгасных канапляна і малочнага заводаў і электрастанцыі.

Зусім мэтазгодна арганізацыя саўгасна - калгаснага насеннаводнага камбінату. У Беларусі толькі зараз прыступаюць да арганізацыі ўласнага насеннаводства. Калі ўлічыць, што пажаданых вынікаў у гэтай складанай галіне можна дабіцца толькі пры плянавасьці, рацыянальным выкарыстоўваньні інвэнтару і сродкаў, дык стварэньне насеннаводнага саўгасна - калгаснага камбінату выклікаецца само сабою.

НКЗ БССР і мяркуе пайсьці па гэтым шляху. У радзе акруг выпучаюцца 10 саўгасаў для арганізацыі ў іх насеннаводства. Вакол кожнага з гэтых саўгасаў будуць створаны спэцыяльныя насеннаводныя калгасы. У галіне кіраўніцтва напрамку гаспадарчі калгасы будуць падпарадкаваны саўгасам. Агульнымі для калгасаў і саўгасаў будуць машыны і інвэнтар, а значыць апрацоўка глебы і насеньня.

Не хапае кваліфікаваных рабочых для будаўніцтва

Саюзныя і гаспадарчыя арганізацыі мапа цікавяцца падрыхтоўкай кваліфікаванай рабсілы

Сёлета па БССР будзе праведзена будаўніцтва на 140 мільёнаў рублёў — на 100 проц. больш, чым у мінулым годзе. Для будаўніцтва патрабуецца 100 тыс. рабочых. Поўнасьцю патрабаваньне ў рабочай сілё ня будзе задаволена. Не хапае 2.000 цесьляроў, 400 бэтоншчыкаў, 300 арматуршчыкаў, 400 сталесараў, 2.000 каменшчыкаў, 700 камнябойцаў і г. д. Па лініі Наркампрацы, у гэтым годзе мяркуецца падрыхтаваць ня менш 6.000 рабочых будаўнікоў розных прафэсій. На гэту мэту адпушчана звыш мільёна рублёў.

Зараз разгорнута вялікая сетка розных курсаў па падрыхтоўцы будаўнікоў у Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Оршы, Бабруйску, Барысаве. Адкрыліся курсы ўдарнікаў у Менску, Гомелі, Віцебску і Магілеве. Гэтыя курсы ўкамплектаваны партыйцамі і камсамольцамі, якія мабілізуюцца на будаўніцтва. Пакуль што на іх занята 100 чалавек.

Апрача таго Наркампрацы падрыхтоўвае ў Менску на курсах ЦІП 200 інструк тароў-брыгадзіраў. Усе гэтыя курсы могуць задаволіць толькі нязначную частку патрэбы ў кадрах.

Трэба адзначыць, што ажыцьцяўленьне нават гэтых мінімальных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы кадраў для будаўніцтва сустрэне сур'ёзныя перашкоды, галоўным чынам, у адносінах камплектаваньня курсаў.

Ня гледзячы на вялікую патрэбу ў кваліфікаваных будаўнікох, будаўнічыя арганізацыі Беларусі зварачаюць мала ўвагі на пытаньні падрыхтоўкі кадраў. Такія арганізацыі, як Белдазяржбуд, Белжылсаюз зусім не вылучаюць кандыдатаў для пасылкі на курсы. Мала праяўляе сябе і саюз будаўнікоў.

Менская біржа працы не спраўляецца з работай па вярбоўцы беспрацоўных на курсы падрыхтоўкі. Многія беспрацоўныя ня ведаюць нават аб існаваньні такіх курсаў.

Падрыхтоўка да міжнароднага жаночага дня

У Міжнародны дзень работніцы, 8-га сакавіка, у саўгасах Беларусі адкрываецца 12 пастаянных і 50 сэзонных ясьляў-пляцовак.

Саюз сельгаспрацоўчых разам з Белсельтрэстам вызначылі арганізаваць грамадзкае харчаваньне ў 10 саўгасах.

Саюз сельгаспрацоўчых пасылае на курсы падрыхтоўкі ў ВНУ, якія адкрываюцца 1-га сакавіка, 100 батрачак і саўгасьніц.

300 батрачак і саўгасьніц будуць прапушчаны праз курсы трактарыстых, матарыстых, сыраваравў і інш. 10 жанчын вылучаюцца на пасады інструктароў працы.

* * *

Прэзыдыум ЦСПСБ даў прафсаюзным арганізацыям рад паказаньняў аб правядзеньні Міжнароднага жаночага дня. Прафсаюзам запрапанавана ў тыднёвы тэрмін падвесьці выніку працы сярод работніц. Праверка павінна праводзіцца брыгадамі работніц. На прадпрыемствах, у клюбах, чырвоных куткох будуць праведзены вечары, прысьвечаныя Міжнароднаму жаночаму дню. На радзе прадпрыемстваў рыхтуюцца спэцыяльныя нумары насьценных газэт.

Што перадае Менская радыё-станцыя

Чацьвер, 20-га лютага

17-00—Час акцябрат.
17-30—Час студэнта.
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Час грамадзкіх арганізацый.
19-30—Час мацеры і гаспадыні.
20-00—Праверка часу.
20-00—Раб.-сялянскі ўнівэрсытэт радыё.
21-00—На фронце сан. будаўніцтва.
21-30—Трансьляцыя.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дэкадны Камвуз. Заняткі па эканамічным цыклі (лект. т. Гурэвіч), філёзофскім (лект. Валадарынскі) і гістарычным (лект. т. Югаў). цыклі

Пач. а 18 гадз. на ўсіх цыклях.

Дом Асьветы. Сход беспрацоўных членаў саюзу працасьветы наступн. катэгорый: настаўнікаў, выхавальнікаў, бібліятэкараў і тых, што маюць адукацыю ня ніжэй сямігодкі. Пач.—а 19 гадзіне.

Клюб Саўгандальслужачых. Чарговыя заняткі гуртка бягучай палітыкі а 19½ гадзін.

Клюб Харчавікоў. Інтэрнацыянальны вечар, прысьв. трохмесячніку нацыянальнае культуры—а 19 гадз. Уваход па разасланых білетах.

Сталоўка МЦРК № 9. Агульна-вытворчая нарада ў сталоўцы № 9 МЦРК, пры Доме Селяніна,—а 18 гадз. Парадак дня: вынікі сацспаборніцтва і якасьць харчаваньня і абслугоўваньня. Запрашаюцца наведвальнікі сталоўкі.

Фрунз. РК МОПР'у. А 19 гадз. пасяджэньне прэзыд. РК. Для справаздачы выклікаюцца яч. МОПР'у зав. «Пралетары» і галянтарэйнай фабрыкі. Фракцыя РК МОПР'у там-жа—а 18 гадз.

ЗАЎТРА

Кастр. РК МОПР'у. Пасяджэньне прэзыдыуму РК—а 19 гадз. Яўка абавязкова.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Клюб навуковых працаўнікоў. Сход аматараў фотамастацтва членаў сэкцыі —а 21 гадз. Даклад тав. Наўроцкага: «Задачы савецкага фота - аматара».

Да ведама навуковых працаўнікоў. З 20 лютага распачн. падрыхтоўчая кампанія па адборы членаў сэкцыі для пасылкі на курорты. Анкету можна атрымаць у МК і клюбе нав. працаўнікоў у тав. Юдовіча. Запоўненую анкету падаць не пазьней 1-га сакавіка.

Менскае мэдычнае т-ва. 20-га лютага, а 21 гадз. (клюб «Мэдпрацаўнік»), адбудзецца гадавое пасяджэньне т-ва. Парадак дня: — справаздача праўленьня, даклад рэв. камісіі, аб рэарганізацыі т-ва і выбары праўленьня.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Менская АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне парттройкі, якое адбудзецца ў памяшканьні АКК 19-га лютага, у 18 гадзін (Энгельса, 28) наступных т. т.:

Мельнікава П. К. — яч. зав. «Камунар», Яноўскага Кастуся, Засімчука С. Д., Марціновіча М. К., Сьвінтухова С. С., Гайдука П. І., Мікалаевіча Я. П. — яч. зав. «Энэргія» Таболіна М. К., Казака Я. І., Ароцкера І. Г., Сандара В. С., Мядоўскага М. Я. і Васковіча І. Ю. — яч. заводу «Бальшавік»; Кудрэвіча П. І. — Негарэльская яч., Шапіра К. Ф., — Койданаўская яч., Шыманскую І. І. — Негарэльская яч., Уельска-га Д. С. — Нявеліцк. яч, Яскевіча В. А. —Койданаўская яч. і Немалякіна А.М. — яч. №-скага пагран. атраду.

Сакратары гарадзкіх ячэек (г. Менску), таварышы якіх выклікаюцца, павінны таксама зьявіцца на пасяджэньне парттройкі. Яўка абавязкова.

19-га лютага, а 18½ гадз., у Доме Камасьветы адбудзецца даклад тав. Стракоўскага на тэму: «Вынікі выкананьня прамфінпляну ў прамысловасьні БССР за першы квартал».

Пасьля дакладу — канцэрт А. І. Загорскай.

Білеты для парт. і камс. актыву ў чытальні Дому.

ВЕЧАР МОПР'у

СЭКЦЫІ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ

прызначаны на 19 лютага,

— **адбудзецца 21 лютага** —

ў ДОМЕ АСЬВЕТЫ.

Пачатак а 8 г. увечары.

Б. Д. В.

ДРУКУЕЦЦА і СКОРА ПАСТУПІЦЬ У ПРОДАЖ КНІЖКА

Я. ЧАЛЯДЗІНСКІ. „БАРАЦЬБА ЗА КАЛГАСЫ“

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Гістарычны мастацкі фільм у 10 частках.
ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА
Паводле вядомага раману Віктара Гюго
Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 30 м., 2-га—8 г. 40 м., 3-га—10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО Пятэрвацыянал
2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі
Мастацкі фільм
ТРАНСПАРТ АГНЮ
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
кіно-часопіс „Сав. Беларусь“ № 2 Белдзяржкіно.
Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Пралетары
2-гі тыдзень нямецкі фільм
МЕРТВАЯ ПЯТЛЯ
драма з цыркавога жыцьця ў 8 частках.
У галоўнай ролі
ВЭРНЭР КРАУС і ЖЭНІ ЮГО.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Ю ы Піянэр“
2 фільмы ў адзін сэанс
1. Мастацкі фільм ВАЙСКОВЫЯ САБАКІ у 5 частк.
2. Навукова папулярны фільм Вада і яе энэргія ў 3-х частк.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО Спартак
Выдатны фільм
ПАТОМАК ЧЫНГІС-ХАНА
драма ў 8 частках.
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: 1—6 г. 30 м., 2—8 г. 30 м., 8—10 гадз. 30 м.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Пятніца, 21 лютага, адкрыты спэктакль
ПРЭМ'ЕРА С. ГОДЫНЭР
ДЖЫМ КУПЕРКОЛ
у 4 акт. і 10 абразох.
Пастаноўшчык Л. М. Літвінаў.
Білеты ў рабочай касе і у касе тэатру
Пачатак роўна а 8 г. 30 м.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — ЖІЗДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках Таварыства. Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

У АГНІ НАРОДЖАНЫЯ (В О Л А Т)
Вытворчасьць Белдзяржкіно.
Будзе дэманстравацца одначасова з лепшымі кіно-тэатрамі Масквы і Ленінграду.

ВЫШЛІ З ДРУКУ і ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ:
СЯЛЯНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА.
А. БЕЛІЦЭР. Як папераджаць і лячыць каросту ў коняй. Стар. 23. Цана 10 кап.
А. ДУНІН. Палепшым важнейшае ўгнаеньне нашых палёў (аб новым спосабе захаваньня гною). Стар. 40. Цана 8 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
ДА ТЫДНЮ ВАЙСКОВАЙ КНІЖКІ
Клюбы, нардамы, чырвоныя куткі, вайсковыя часткі павінны папоўніць свае бібліятэкі наступнымі кніжкамі на беларускай мове:

А. ІСБАК.—Са стрэльбай і кнігай—чырвона армейскія будні. . Стар. 262. Ц. 30 к.
Б. ПАПОЎ.—Чырвоная армія і яе задачы Стар. 68. Ц. 5 к.
Н. ЛІНОЎСКІ.—Тэрыторыяльнік на вёсцы. Стар. 44. Ц. 8 к.
Н. ЧУПРАКОЎ.—Камсамол на дапрызыўнай падрыхтоўцы. . . Стар. 41. Ц. 10 к.
Л. МАЛІНОЎСКІ.—Жанчына і абарона. Стар. 32. Ц. 5 к.
Н. ЧУПРАКОЎ.—Абавязкі пераменнага складу тэрыторыяльных войск у пэрыяд паміж зборамі. . . . . Стар. 44. Ц. 10 к.
Г. ШТЭРН.—Дысцыпліна ў Чырвонай армії. Стар. 44. Ц. 10 к.
С. СТЭРЛІН.—Чым насельніцтва дапаможа ў часе грамадзянскай вайны Стар. 40. Ц. 10 к.
Д. ФУРМАНАЎ.-Чырвоны дэсант--апавяданьне Стар. 72. Ц. 20 к.
— Чаму мы перамаглі ў грамадзянскай вайне Стар. 22. Ц. 10 к.
Д. ДЗЯМЕНЬЦЕЎ, М. СКУРСКІ.—На франтох —апавяданьні . . Стар. 45. Ц. 15 к.
М. МОСКВІН.—Падрыўнікі. Стар. 64. Ц. 15 к.
В. ЧУДЗІНАЎ.—Партызан няпамятны. Стар. 40. Ц. 20 к.
В. ЮШКОЎ.—Выхад з бою. Стар. 32. Ц. 10 к.
К. ВАРАШЫЛАЎ.—Сталін і Чырвоная армія Стар. 46. Ц. 6 к.
Пад польскім арлом. Стар. 22. Ц. 10 к.
М. КАШЭН, К. ВАРАШЫЛАЎ, М. ЛІТВІНАЎ.—Замеры буржуазіі супроць СССР і мірная палітыка Саветаў. Стар. 109. Ц. 10 к.
ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ І АДДЗЯЛЕНЬНЯХ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты ад 2 гадзіны дня

Менск. Галоўлітбел № 337.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.